

ЗВАНЫ АД ПЕНСІЯНЕРА 7

АСАБЛІВАСЦІ «АСЕННЯГА САЛОНА» 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2019 г. СУБОТА № 210 (29077)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Мы з Цэнтральным банкам Расіі прынцыпова дамовіліся аб гарманізацыі грашова-крэдытных палітык па асобных пытаннях. І ў Беларусі, і ў Расіі павінен быць адзін рэжым манетарнай палітыкі — гэта таргетаванне інфляцыі. У Расіі гэты рэжым ужо ўкаранёны, у Беларусі трэба будзе яго рэалізаваць. Мы прадугледжваем, што калі заканадаўства будзе прыведзена ў парадак для адпаведнасці гэтаму рэжыму, то ён можа пачаць функцыянаваць з 1 студзеня 2021 года».*

# Майстры і Памяць



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ёсць у гэтым добрая сімвалічнасць — менавіта ў дні Памяці са сталічнага абеліска Перамогі, які цяпер рэстаўруюць, здымаюць завесу і рыштаванні. Праўда, работы спецыялістам яшчэ хопіць. Сяргей САЧОК — чаканшчык, зварshчык, будаўнік, цяпер займаецца рэстаўрацыяй бронзавых барэльефаў у ніжняй частцы абеліска. Майстар, які ўжо дваццаць гадоў працуе ў прадпрыемстве «Белрэстаўрацыя», другі раз бярэ ўдзел у аднаўленні помніка. На гэтым фота ён ачышчае і чаканіць барэльеф, створаны вядомым скульптарам, народным мастаком Беларусі Сяргеем Селіханавым. А на чарзе — барэльеф работы славутага Заіра Азгура.

## КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў прагнозныя параметры на 2020 год: рост ВУП на 2,8 %, экспарту на 3,6 %, інфляцыя не больш за 5 %.**

• Беларусь і Узбекістан выканалі ўжо трэць мерапрыемстваў падпісанай у 2018 годзе дарожнай карты па развіцці супрацоўніцтва паміж краінамі, паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас на сустрэчы з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым.

• **Беларусбанк знізіў стаўкі па крэдытах на жыллё.**

• Мінск упрыгожаць 30 навагодніх ёлак, адна з самых незвычайных будзе каля Ратушы.

• **У «Вялікім камені» плануецца пабудаваць завод па выпуску рухавікоў класа Еўра-6 для легкавушак.**





ISSN 1990 - 763X


Актуальна

## СПЫНІЦЬ НЕБЯСПЕЧНЫ ВІР

### Расследаванне наркатычных злачынстваў пачынаецца з інтэрнэт-разведкі




**Нягледзячы на актыўную і шматбаковую барацьбу з незаконным распаўсюджваннем і спажываннем псіхатропаў, гэтая праблема не траціць сваёй вастрыні. Пра гэта ішла размова на нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што прынятыя ў Беларусі ў 2014 годзе сістэмныя меры дазволілі пераламіць сітуацыю. Але казаць, што праціўнік пераможаны канчаткова, пакуль рана. Таму зацікаўленым ведамствам трэба думаць, што рабіць далей, якія хады яшчэ здзейсніць, каб паставіць чарговыя заслоны на шляху наркатрафіку і распаўсюджвання дурману ўнутры краіны.**

**А аб'ём наркатрафіку праз Беларусь расце. Сёлета агульная вага канфіскаваных наркатычных і псіхатропных рэчываў ужо перасягнула тону. І гэта толькі за 9 месяцаў! З іх 500 кілаграмаў знайшлі міліцыянеры, а астатнія 600 — пагранічнікі і мытнікі. Гэтыя лічбы агучыў начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Генадзь КАЗАКЕВІЧ.**


СТАР. 5


Культасвета

## З ЛЮБОЎЮ, МІНСК

### Як мастакі гавораць з горадам на мове стрыт-арту

**У сярэдзіне лістапада ў Мінск прыедзе мастацкі дуэт з Іспаніі, каб завяршыць манументальны стрыт-арт-трыпціх на вуліцы Прытыцкага. Два з трох муралаў на адной з галоўных транспартных артэрый сталіцы ўжо радуюць вока прахожых і аўтамабілістаў. А ўсе разам шматметровыя карціны на тарцавых фасадах дамоў №№ 134,136, 150 — часткі адзінай канцэпцыі міжнароднага праекта «Будучыня», які прадстаўляе Беларусь заўтрашняга дня.**


СТАР. 12




# ДЗЕЛАВЫЯ СТАСУНКІ Ў АТМАСФЕРЫ ДРУЖБЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з візітам у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Кантакты з кіраўніцтвам і дзелавымі коламі гэтай краіны стануць працягам як шматгадовай дружбы і супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, так і праведзеных афіцыйных перагавораў з наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброеных Сіл ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам, які ў верасні гэтага года упершыню наведаў Беларусь з афіцыйным візітам.

Пералік напрамкаў, якія ўяўляюць узаемны інтарэс для бакоў, уключае не толькі пытанні пашырэння гандлёвых адносін, але і развіццё інвестыцыйнага супрацоўніцтва ў розных сферах. Аб'яднаныя Арабскія Эміраты могуць выступаць у якасці пункта ўваходу беларускіх тавараў і паслуг на рынкі іншых краін рэгіёна. Гэта асабліва актуальна з улікам падрыхтоўкі да сусветнай выстаўкі «ЭКСПА-2020», якая адкрыецца ў Дубаі праз год і будзе ў тым ліку ўключаць нацыянальны павільён Беларусі.

Добрая навіна

# ФУРЫ ПАЙШЛІ Ў АБХОД ГОМЕЛЯ

**На тыдзень раней, чым было запланавана, адкрылі новы мост цераз Сож**

**Гэты мост — частка аўтамагістралі М8/Е95. Па пераправе рухаецца транспарт ад граніцы Расіі да Украіны. Прайшло крыху больш за год з моманту, калі была выяўлена небяспечная сітуацыя з канструкцыямі старога моста, які знаходзіцца побач і чакае дэмантажу. Тады, у жніўні мінулага года, улады прынялі тэрміновае рашэнне закрыць яго для руху. Велікагрузны транспарт вымушана пайшоў праз абласны цэнтр, чым утвараў многа нязручнасцяў для гамяльчан.**



І вось важная транспартная артэрыя зноў ажыла. Ва ўрачыстым адкрыцці моста ўзяў удзел **прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей РУМАС.** Ён заўважыў, што значнасць увядзення аб'екта складана пераацаніць:

— Дзякуючы напружанай працы маставікоў і дарожнікаў гэты аб'ект атрымалася пабудаваць раней за вызначаны тэрмін. Работы, у якіх было задзейнічана 130 чалавек, вяліся ў тры змены, паскоранымі тэмпамі пры строгім выкананні ўсіх тэхнічных нарматываў. Падчас узвядзення аб'екта выкарыстоўваліся самыя сучасныя тэхналогіі, айчынныя будаўнічыя матэрыялы.

Новы мост адпавядае патрабаванням бяспекі. Спецыялісты запэўніваюць: ён праслужыць не менш за 100 гадоў. Даўжыня новага моста складае 544 метры. Для яго збудавання спатрэбілася звыш трох тысяч тон металу. Кошт будаўніцтва з улікам добраўпарадкавання склаў 58 мільёнаў рублёў. Прапускная здольнасць — 12 тысяч машын у суткі. Канструкцыя моста лягчэйшая, чым у бетонных аналагаў, пры гэтым яна можа вытрымаць не меншую нагрузку.

Пакуль вяліся работы па будаўніцтве новага моста пад Бабовічамі, транспарт, у тым ліку цяжкія фуры, рухаўся праз Гомель. Гэта прыввяло да значнага павелічэння нагрузкі на гарадскую вулічную сетку. Цяпер прадугледжана аднаўленне тых дарог, па якіх былі арганізаваны рух на перыяд закрыцця моста.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** падкрэсліў, што новы мост будзе таксама спрыяць развіццю іншых транспартных інфраструктурных праектаў, якія накіраваны на паступовы адток аўтамабіляў з цэнтра горада і, як вынік, на паляпшэнне яго экалогіі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Блізкая ўлада

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «УСЕ РЭГІЁНЫ ПАВІННЫ РАЗВІВАЦЦА ДЫНАМІЧНА»

**Каля трыццаці грамадзян запісаліся на асабісты прыём да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай, які адбыўся ў Расонах.**



Фота БелТА.

Па традыцыі сярод наведвальнікаў былі жыхары іншых абласцей і нават сталіцы. А месца правядзення прыёму было абрана не выпадкова. Наталля Качанава адзначыла, што мясцовы жыхар інфармаваў пра неабходнасць развіваць рэгіён, дзе жыве каля дзевяці тысяч чалавек. Сігнал зацікавіў абгрунтаванасцю і пералічэннем канкрэтных фактаў.

Наталля Качанава нагадала, што кіраўнік краіны ў Пасланні да парламента і беларускага народа акцэнтаваў увагу на тым, што ўсе рэгіёны краіны, незалежна ад колькасці насельніцтва і іншых фактараў, павінны развівацца дынамічна. Мясцовай уладзе трэба зрабіць так, каб была добрая перспектыва, людзі не пакідалі родны край, каб сюды вярталася моладзь.

Падчас прыёму звярнуліся па дапамогу бацькі чацвярых дзяцей з Асіповіч Магілёўскай вобласці. Жывуць яны ў невялікай кватэры ў доме барачнага тыпу, пабудаваным у 1958 годзе. Шматдзетная сям'я мае права на паляпшэнне жыллёвых умоў і спадзяецца справіць наваселле з мінімумам выдаткаў: хочуць купіць жыллё на другасным рынку і атрымаць ільготны крэдыт. Але сродкаў дзяржаўнай падтрымкі не хапае. Наталля Качанава нагадала, што дапамога шматдзетным — адзін з дзяржаўных прыярытэтаў. Мясцовая ўлада падбярэ заяўнікам аптымальны варыянт.

Мінчанка таксама прасіла вырашыць жыллёвае пытанне. Яна жыве ў кватэры з сынам каля чвэрці стагоддзя. Афіцыйна жыллё лічыцца ў інтэрнаце, які быў пабудаваны як жылы дом на сродкі Чырвонага Крыжа, таму ёсць праблема з доказам прававога статусу пражывання. Вярхоўны суд, дарэчы, пацвердзіў, што заяўніца мае рацыю. Але, па яе словах, у чыноўнікаў Мінскага гарвыканкама іншы погляд на праблему. Муж меў намер пабудаваць жыллё, але памёр... Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта даручыла адказным асобам разабрацца ў даволі нестандартнай сітуацыі.

Пасля звароту дырэктара школы мастацтваў будзе зроблены рамонт участка дарогі Расоны — Гарбачы. Заяўніца хваліецца за бяспеку пры перавозцы дзяцей. Дадзена заданне ўжо да канца лета наступнага года вырашыць праблемнае пытанне.

Яшчэ адна заяўніца з Гродзенскай вобласці расказала пра праблемы, звязаныя з налічэннем пенсіі памерлага мужа-ліквідатара на сына, інваліда другой групы. Сітуацыя вельмі заблытаная.

А жыхары Салігорска паскардзіліся на тое, што недалёка ад індывідуальнага жылля, літаральна за дваццаць метраў, плануюць пабудаваць завод металаканструкцый. Ужо пачалі работы, усталявалі агароджу. Людзям паабяцалі, што сітуацыя будзе ўважліва вывучана. Калі месца размяшчэння будучага прадпрыемства насамрэч не адпавядае нормам, вінаватых пакараюць, будаўніцтва забароняць. Таму абавязкова трэба своечасова разабрацца ў тэме.

Жыхар Смалявіч хацеў пабудаваць жыллё ў Мінску. Заплаціў каля 43 тысяч долараў, а фірма не выканала сваіх абавязацельстваў. Наваселле павінна было адбыцца ў 2017-м... Наталля Качанава распарадзілася даць адпаведнае даручэнне Генеральнай пракуратуры, бо такія паводзіны забудоўшчыка нагадваюць махлярства.

Усе звароты вывучаць вельмі ўважліва, і ўсім пастараюцца дапамагчы.

Цікава, што сярод заяўнікаў былі некалькі прадстаўнікоў бізнесу, якія спадзяваліся на дапамогу ў рэалізацыі праектаў у сталіцы. Карыстаючыся выпадкам, Наталля Качанава прапанавала інвеставаць грошы ў Расонскі раён. Ён экалагічна чысты, тут каля двухсот азёр. А недалёка Полацк і Наваполацк, да таго ж раён мяжуе з Расіяй. Цікава, што перспектывы супрацоўніцтва з прадстаўнікамі бізнесу адразу ж абмеркавалі кіраўнікі мясцовай улады. Гаварылі наконт праектаў забудовы ў прывабных з пункту гледжання экалогіі месцах раёна.

Наталля Качанава, каментуючы прадстаўнікам СМІ вынікі праведзенага прыёму грамадзян, падкрэсліла, што і надалей звароты ў Адміністрацыю Прэзідэнта і на імя кіраўніка дзяржавы будуць пільна вывучацца.

Маніторынг падкажа наступнае месца правядзення такога прыёму. Улада ведае, што трэба рабіць. Старшыні аблвыканкама будзе даручана правесці пасяджэнне наконт развіцця Расонскага раёна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## Информация о совершении сделки, в отношении которой имеется заинтересованность аффилированных лиц

| | |
|---|---|
| Полное наименование | Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити» |
| Местонахождение | 220043, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7 |
| Дата принятия решения о совершении сделки | 28.10.2019 г. |
| Вид сделки | Договор поручительства |
| Стороны сделки | ООО «Темпл Сити» ОАО «БНБ-Банк» |
| Предмет сделки | Денежные средства |
| Критерии заинтересованности в соответствии с ч. 1 ст. 57 Закона «О хозяйственных обществах» лиц, указанных в абзацах втором – четвертом ч. 7 ст. 57 Закона «О хозяйственных обществах» | Договором поручительства обеспечиваются обязательства по Кредитному договору, заключаемому между участником ООО «Темпл Сити» (доля в уставном фонде в размере 76 % уставного фонда) и ОАО «БНБ -Банк» |
| Сумма сделки | 320 000,00 белорусских рублей (триста двадцать тысяч белорусских рублей 00 копеек) |
| Балансовая стоимость активов ООО «Темпл Сити», определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении сделки | 8 415 000,00 белорусских рублей (восемь миллионов четыреста пятнадцать тысяч белорусских рублей 00 копеек) |



**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует о снятии с электронных торгов, назначенных на 12.11.2019 в 10.00** (публикация извещения в газете «Звязда от 26.10.2019) **недвижимого имущества (лоты №№1–4), транспортных средств (лоты №№ 5–9), оборудования (лоты №№ 10–27)**, принадлежащих ОАО «Строймаш»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704 92 06. E-mail: **auction@cpo.by**. УНП 100104712



## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белгипроводхоз»

**Лот № 1**: инженерная система Kyocera KM-4800W, инв. № 48007, 2010 г. в. Начальная цена с НДС – 928,59 бел. руб. Задаток – 92,86 бел. руб.
**Лот № 2**: сканер полноцветный Contex Chameleon Tx36, инв. № 6279. 2006 г. в. Начальная цена с НДС – 486,21 бел. руб. Задаток – 48,62 бел. руб. **Местонахождение**: г. Минск, пр-т Машерова, 25.
**Условия аукциона**: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 10 рабочих дней после подписания договора купли-продажи. 3. Продавец обязуется передать Победителю аукциона (претенденту на покупку) Объект (Объекты) в течение 20 календарных дней после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов). 4. Самовывоз Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) с места хранения Объекта (Объектов). 5. Возместить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 1 000,00 бел. руб.
**Аукцион состоится 16.11.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец**: РУП «Белгипроводхоз», г. Минск, пр-т Машерова, 25-201, тел. 8 (017) 334-35-66. **Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **16.11.2019** (Лот №_). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **14.11.2019 в 11.00**. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Контактное лицо для осмотра Объектов – Бриш Виктор Владиславович, тел. 8 (029) 136 00 31. Первое извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.05.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

## Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», тел. 8 (0232) 21 60 07

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, руб. с НДС | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Автомат для холодной навивки пружины АА5109 с инв. № 1986, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **3 400,00** | **340,00** |
| 2 | – Автомат для холодной навивки пружины АА5214А с инв. № 1772, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **2 600,00** | **260,00** |
| 3 | – Пружинный навивальный автомат АА5109 с инв. № 2417, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **3 400,00** | **340,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок и место подачи заявления** | **По 2 декабря 2019 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **4 декабря 2019 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 02.11.2019 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

Камунальныя стасункі

# КАПРАМОНТ ПА КВАРТАЛАХ

## Жыллё ў сталічных раёнах будуць мадэрнізаваць згодна з яго ўзростам

**Максімальнага эфекту пры мінімальных затратах хочуць дасягаць камунальнікі падчас капрамонту. З 2020 года па ўсёй Беларусі плануецца штогод рамантаваць ужо па тры і больш працэнты жылля. У сталіцы, напрыклад, гэта будзе 247 дамоў агульнай плошчай больш за мільён квадратных метраў.**

Падыходы да капрамонту ў сталіцы сёлета кардынальна змяніліся. Перш за ўсё гэта датычыцца правядзення рамонту жылля з долевым удзелам грамадзян у фінансаванні работ. У Мінску да такога гатовы чатыры сталічныя дамы. Пры выкананні стандартнага комплексу мерапрыемстваў на доме (без уліку мадэрнізацыі сістэмы ацяплення) ад кожнай кватэры мусяць на працягу дзесяці гадоў заплаціць прыкладна 1200 долараў, каб пакрыць сваю долю ўдзелу ў мадэрнізацыі. Гэта прыблізна 17—23 рублі штомесяц.

Яшчэ адна змена закранула размеркаванне запланаванай лічбы капрамонту (2,8 % ад агульнай колькасці дамоў, што маюць у гэтым патрэбу). Раней яна была аднолькавая для ўсіх дзевяці раёнаў Мінска. Цяпер жа планавыя лічбавыя паказчыкі будуць падзелены па раёнах з улікам гадоў забудовы жылфонду.

— Калі параўноўваць жыллё ў Партызанскім раёне, дзе пераважае стары фонд 40—50-х гадоў забудоўлі, і Фрунзенскі, які адносна малады, то пры аднолькавых лічбах капрамонту ў іх гадоў праз дзесяць мы б выйшлі ў Фрунзенскім раёне на рамонт дамоў, збудаваных у 80—90-х, а ў Партызанскім — захраслі б на 50-х. Каб такога не адбылося, плошча рамантаванага жылля будзе вызначацца адпаведна з часам яго стварэння. У Партызанскім будзе рамантавацца больш, чым у Фрунзенскім, — расказаў **Уладзімір ЛЕБЕДЗЬ, галоўны інжынер Мінскай жыллёвай гаспадаркі.**

Для кожнага раёна Мінска распрацоўваецца перспектыўная праграма на 2021—2025 гады, дзе асаблівая ўвага будзе ўдзелена комплекснасці падыходу да капрамонту — яго правядзенню па кварталах.

— Гэтая работа пачалася ўжо сёлета, — падкрэсліў спецыяліст. — Калі мы ўваходзім з капрамонтам у квартал, мы адразу робім гэта на пяці-шасці дамах. І ўжо на гэтай стадыі правядзення капрамонту праектуюцца за кошт бюджэту Мінска і распрацоўваюцца планы капітальнага рамонту і двароў. Як толькі з дамоў сыходзяць будаўнікі, прыходзяць рамонтнікі па двары.



**— У Мінскай вобласці за дзевяць месяцаў гэтага года пасля капрамонту ўведзена ў эксплуатацыю 219,4 тысячы квадратных метраў пры плане 214,7 тысячы. Праведзена інвентарызацыя жыллёвага фонду. Па кожным доме па выніках мінулага ацяпляльнага сезона вызначаны лічбы цепласпажывання, устаноўлены клас энергаэфектыўнасці, — расказаў Павел ШЭЙПАК, намеснік генеральнага дырэктара па жыллёвай гаспадарцы ЖКГ Мінскай вобласці.**

Тыя некалькі дамоў рамантуюцца ў межах аднаго праекта, над якім працуе адзін праектыроўшчык. Гэта робіцца дзеля адзінага падыходу да капрамонту. Пасля ўзгаднення праектна-каштарыснай дакументацыі праект будзе выстаўляцца на таргі, каб абраць адну падрадную арганізацыю для выканання рамонтных работ. Такім генпадрадчыкам (буйным арганізацыям, якія паказалі сябе з найлепшага боку на будаўнічым рынку) будуць створаны асаблівыя ўмовы. Такім чынам маркуюць выключыць магчымасць удзелу ў конкурсе дробных арганізацый, якія сёння ёсць, а заўтра няма.

**Ірына СІДАРОК.**

Юбілей

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ПРАЕКТАЎ

## «Гродзенская праўда» адзначае 80-гадовы юбілей

**Створаная напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны газета не спыніла сваю дзейнасць і ў гады ваеннага ліхалецця. Цяпер тыраж галоўнага абласнога выдання разам з рэкламным дадаткам дасягае 70 тысяч паасобнікаў у месяц. «Гродзенская праўда» ў ліку першых СМІ Беларусі пачала выходзіць у электронным выглядзе. Новым кірункам работы стала выдавецкая дзейнасць. У багата ілюстраваных выданнях сабраны матэрыялы некалькіх топавых праектаў, якія выходзілі ў газеце на працягу 1,5-2 гадоў.**

Як адзначыла **галоўны рэдактар Лілія НАВІЦКАЯ,** большасць кніг — гэта вынік доўгатэрміновых праектаў, над якімі працуе амаль увесь калектыў рэдакцыі. Напрыклад, у выданні «Гродзеншчына гасцінная» сабраны матэрыялы, якія публікаваліся ў газеце пад рубрыкай «Турызм без чамадана». Гэта праект, падчас якога журналісты пабывалі ва ўсіх раёнах вобласці, расказалі пра турыстычны патэнцыял большасці населеных пунктаў, іх брэндавыя мерапрыемствы.



Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

Пасля водных вандровак з'явілася цікавая кніга «Па Нёмане, Віліі, Шчары...» Цяпер у газеце распачаты новы турыстычна-пазнавальны праект аб запаведных тэрыторыях, які таксама будзе афармлены ў асобнае маляўнічае выданне.

У ліку выданняў — зборнік аб лаўрэатах прэміі імя Аляксандра Дубко, прэстыжнай абласной прэміі дзеячам культуры і мастацтва. У ліку лаўрэатаў ёсць і журналісты газеты. Як паведаміла галоўны рэдактар выдання, цяпер ідзе работа над праектам «Імя героя» ў гонар людзей, чые імёны ўвекавечаны ў назвах вуліц і плошчаў Гродзеншчыны. Праект прысвечаны юбілею Перамогі і 75-годдзю Гродзенскай вобласці.

Дарэчы, ваеннае мінулае паўплывала і на саму газету. Некалькі гадоў яна выходзіла ў партызанскім атрадзе, а першы пасляваенны творчы калектыў складаўся поўнасцю з былых франтавікоў, у іх ліку былі Васіль Быкаў і Аляксей Карпюк. Некаторыя асабістыя рэчы пісьменнікаў знаходзяцца ў музеі газеты.

На вітрынах музея размешчаны і шматлікія ўзнагароды. «Гродзенская праўда» — лаўрэат шасці нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара». Некалькі статуэтак уручана якраз за праекты, якія знайшлі ўвасабленне ў асобных выданнях. Газета рабілася і лаўрэатам турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь» і многіх іншых.

У рэдакцыі ўдзяляюць увагу развіццю электроннай версіі газеты. Сайт пастаянна абнаўляецца. Сюды трапляе ўся аператыўная інфармацыя не толькі рэгіёна, але і краіны. Гэтаму спрыяе стварэнне кластара, у які аб'яднаны «Гродзенская праўда», ГрДУ і ўсе раённыя газеты вобласці.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нарышкін заявіў, што ў Расіі няма стапрацэнтнага пацвярджэння ліквідацыі верхавода ІД

Дырэктар Службы знешняй разведкі Расіі заявіў аб адсутнасці доказаў знішчэння лідара так званай «Ісламскай дзяржавы» Абу Бакра аль-Багдадзі. «Генетычнага матэрыялу, які дазволіў бы са стапрацэнтнай упэўненасцю казаць пра гэта, няма», — сказаў ён.

27 кастрычніка прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў аб ліквідацыі аль-Багдадзі ў ходзе спецаперацыі ў сірыйскай правінцыі Ідліб. Амерыканскі лідар падзякаваў за садзейнічанне ў правядзенні аперацыі Расіі, Іраку, Сірыі і Турцыі.

У Мінабароны РФ заявілі, што не валодаюць дакладнай інфармацыяй аб знішчэнні аль-Багдадзі. Сусветная супольнасць назвала ліквідацыю завадатара ІД важным, але не вырашальным крокам, заклікаўшы працягнуць барацьбу з тэрарызмам.

### Трамп змяніў месца жыхарства з-за... падаткаў



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пацвердзіў, што памяняў пастаяннае месца жыхарства з Нью-Ёрка на горад Палм-Біч (штат Фларыда). Адпаведнае паведамленне ён размясціў на сваёй старонцы ў Twitter.

«Я і мая сям'я зробім Палм-Біч (штат Фларыда) нашым пастаянным месцам жыхарства. Я люблю Нью-Ёрк і жыхароў Нью-Ёрка, але, на жаль, нягледзячы на тое, што я кожны год плачу мільёны долараў падаткаў гораду, штату і мясцовым уладам, да мяне вельмі дрэнна адносіліся палітычныя лідары як у горадзе, так і ў штаце. Мала да каго так дрэнна адносіліся. Я вельмі не хацеў бы прымаць падобнае рашэнне, але ў канчатковым выніку так будзе лепш для ўсіх. У якасці прэзідэнта я заўсёды буду гатовы дапамагчы Нью-Ёрку і выдатным людзям Нью-Ёрка, ён заўсёды будзе займаць у маім сэрцы асаблівае месца», — напісаў кіраўнік амерыканскай адміністрацыі.

У той жа час газета The New York Times са спасылкай на дакументы суда акругі Палм-Біч паведаміла, што Трамп памяняў пастаяннае месца жыхарства ў сувязі з падатковымі пытаннямі.

Трамп у верасні апавясціў суд пра тое, што яго пастаянным месцам жыхарства варта лічыць маёнтак Мара-Лага ў Фларыдзе. Ранейшым месцам пастаяннага пражывання кіраўніка дзяржавы быў хмарачос Trump Tower на Пятай авеню Нью-Ёрка. У Trump Tower знаходзіцца штаб-кватэра групы кампаній Trump Organization, а таксама размяшчаўся перадвыбарчы штаб палітыка ў 2016 годзе.

Прэзідэнт ЗША ўказаў у якасці іншых месцаў пражывання адрасы Белага дома ў Вашынгтоне і прыватнага гольф-клуба ў Бедмінстэры (штат Нью-Джэрсі), дзе ён адпачывае некалькі тыдняў летам.

### Дзяржэпартамент сцвярджае аб датычнасці Расіі да распальвання супярэчнасцяў у Чылі

Злучаныя Штаты бачаць прыкметы таго, што ў грамадскую дыскусію ў Чылі ўмешваюцца «расійскія інтэрнэт-тролі», якія імкнуцца перашкодзіць канструктыўнаму дыялогу. З такім сцвярджэннем выступіў на брыфінгу для журналістаў прадстаўнік Дзяржэпартамента высокага рангу, выказванні якога распаўсюдзіла прэс-служба ведамства.

«Што датычыцца Расіі, то мы бачым выразныя прыкметы таго, як людзі выкарыстоўваюць у сваіх мэтах гэтыя дэбаты і скажаюць іх з дапамогай злоўжывання тролінгам у сацыяльных медыя, імкнучыся пагоршыць раскол, распаліць канфлікт і выступіць у якасці перашкоды падчас адказных дэмакратычных дэбатаў, замест таго каб дазволіць грамадзянам Чылі весці свае ўласныя абмеркаванні з нагоды курсу, які павінна прыняць іх краіна. У гэтым праблема», — заявіў ён.

Прадстаўнік амерыканскага знешнепалітычнага ведамства не стаў адказваць на пытанне, ці лічыць Дзяржэпартамент гэтых людзей звязанымі непасрэдна з расійскімі ўладамі.

З рэдакцыйнай пошты

# «Родны край»: адрыўны беларускі каляндар на 2020 год

**У выдавецтве «Беларусь» пабачыў свет адрыўны каляндар на 2020 год. І не магу не падзяліцца гэтай радасцю з чытачамі.**

На фоне дзясяткаў (а мо і сотняў) адрыўных календароў, якія выдаюцца на рускай мове і распаўсюджваюцца ў беларускім кнігагандлі, «Родны край» часам губляецца. І ўсё ж і сёлета, як і раней, пабачыў свет гэты «стары знаёмы» многіх беларусаў. Ён яшчэ як бы і просіцца ў кватэры, дамы, адпаведна на сцены тых кватэр і дамоў, дзе штодня гучыць родная беларуская мова. Спадзяёмся, што тыраж у 4500 асобнікаў не будзе залежвацца ў кнігарнях ці кіёсках і павільёнах «Белсаюздрука».

Настрой, тэматыку вызначае ўжо ўступнае слова «Да чытача»: «Прывітанне, шаноўны чытач!

Вы трымаеце ў сваіх руках адрыўны каляндар «Родны край» на 2020 год. Гэты год — трэці па ліку, які ў Беларусі праходзіць пад знакам Года малой радзімы. У сувязі з гэтым мы змясцілі ў наша выданне шмат цікавай інфармацыі пра вялікія і малыя беларускія гарады, вёскі, рэкі, азёры і іншыя прыродныя аб'екты, а таксама пра славутых людзей Беларусі.

Гартаючы старонкі календара, Вы знойдзеце матэрыялы, карысныя для прымянення ў паўсядзённым жыцці: рэцэпты, жыццёвыя і побытавыя парады, а таксама цудоўныя вершы класікаў беларускай літаратуры, размеркаваныя ў адпаведнасці з порамі года. Спадзяёмся, што Вас зацікавіць інфармацыя пра знакі задыяка.

Ад усёй душы жадаем, каб наш каляндар натхняў Вас кожны дзень новага 2020 года і дапамагаў у жыцці!»

Нізкі паклон укладальнікам адрыўнога календара на 2020 год Алесі Коршак і Надзеі Мількевіч. А выдавецтву «Беларусь» — пажаданне, каб у наступным, 2020 годзе, адрыўны каляндар «Родны край» на 2021 год быў выдадзены накладам як мінімум 10 000 асобнікаў. Будзем спадзявацца на гэта!

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ПРАГРАМЫ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СЁМАГА СКЛІКАННЯ

17 ЛІСТАПАДА 2019 года ВЫБАРЫ дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

# АСМАЛОЎСКІ АНДРУСЬ СЯРГЕЕВІЧ



**Праграма кандыдата па Коласаўскай выбарчай акрузе № 106.**

Я, **Андрусь** Асмалоўскі, мне 42 гады, іду ў камандзе **«Аб'яднанай грамадзянскай партыі»,** у якой дзейнічаю ўжо больш 15 гадоў. Маю двух сыноў, вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці інжынер-будаўнік, працаваў у будаўнічай сферы, займаўся архітэктурным праектаваннем, зараз індывідуальны прадпрымальнік, але большасць часу прысвячаю грамадска-палітычнай дзейнасці.

У адрозненне ад праўладных кандыдатаў **лічу**, што жыццёвы ўзровень беларусаў **занадта** нізкі, краіна знаходзіцца ў міжнароднай ізаляцыі, з'явілася пагроза расійскай акупацыі і страты дзяржаўнасці. Гэту сітуацыю трэба змяняць, беларусы **еўрапейскі** народ, варты **значна** лепшага жыцця, беларусам не патрэбныя пастаянныя **дэвальвацыі**, наколькі абясцэніцца беларуская валюта, калі ў наступным годзе сённяшні правіцель працягне свае паўнамоцтвы: зноў 4—5 рублёў за долар? Беларусам не трэба знявага іх выбарчага права, беларусам патрэбна **ўпэўненасць** у заўтрашнім дні. І гэтага дасягнуць **зусім** не складана, як паказвае шматгадовы **досвед** нашых шматлікіх суседзяў.

Сённяшняя ўлада не робіць элементарных захадаў па выхадзе з крызісу, на плечы беларусаў павесілі непасільны цяжар па ўтрыманні шматтысячнага бюракратычнага апарату, утрыманні стратных прадпрыемстваў і калгасаў, раздутага міліцэйскага штату, галоўная мэта якога кантраляваць незадаволены народ, вялікія падаткі непад'ёмныя для вядзення дробнага бізнесу, мільённыя палацы, парады і стратныя гульбішчы. Гэта ўлада абыходзіцца нам вельмі дорага, складваецца ўражанне, што мэта гэтай сістэмы не даббрабыт беларусаў, а сляпое захаванне ўлады і ўтрыманне нашай краіны ў абдымках усходняга «старэйшага брата».

Вакол рынкавая эканоміка і капіталізм, а тут калгасы і пяцігодкі, усе суседзі паважаюць родную мову, нацыянальную валюту, родную сімволіку, тут — русіфікацыя, рубель і сталінізм. На фоне суседзяў Беларусь выглядае савецкім пасмешышчам з адпаведным узроўнем жыцця.

**Пенсійны ўзрост** не можа быць практычна роўным працягласці жыцця людзей, чалавек заслугоўвае пажыць спакойна і годна на старасці. Калі дасягнем скандынаўскай працягласці жыцця 85 гадоў, тады пачнем выходзіць на пенсію ў 65. Адмена пенсій сілавікам у 40—45 гадоў.

**У жыллёвым пытанні** створаны штучны дэфіцыт, у развітых краінах няма такой праблемы. Я за сваё жыццё пабудаваў некалькі дамоў, ведаю рэальны сабекошт квадратнага метра — у разы меншы, чым прапануюць людзям. Цэнтралізаванае размеркаванне жылля — гэта галоўны закабаляльны механізм. Замест годнай зарплаты маўчы — не рыпайся, адстой 10—15 у чарзе, потым яшчэ столькі ж гадоў выплачвай крэдыт і зноў — бойся і не выступай. У суседзяў, у Літве, Польшчы працэнтная стаўка на будаўніцтва 2—4 %, банкі выдаюць без праблем кожнаму, хто працуе. Ільготнае будаўніцтва жылля цяпер з'яўляецца шчылінай для апаратчыкаў, сілавікоў і карупцыянераў.

**Работа дзяржаўных устаноў** — скарачэнне дзяржбюракратыі ў разы, толькі электронны дакументаабарот.

Гэта толькі некаторыя кірункі маёй выбарчай праграмы, асноўныя прынцыпы вам зразумелыя. Паляпшэнне жыцця можа адбыцца толькі з адкрытасцю прадстаўнікоў улады, ліберальнай рэформай эканомікі, актыўнасцю і павышэннем адказнасці грамадзян грамадзянскай супольнасці.

Мне даводзілася працаваць у выбарчай камісіі, пералічваць галасы, і я ведаю, што складаней за ўсё не ўлічыць ваш голас, калі вы прыйшлі ў апошні дзень галасавання, пасля абеду... Прыходзьце 17 кастрычніка і галасуйце за мяне.

Будзем супрацоўнічаць, я запрашаю вас на мае кандыдацкія сустрэчы ва ўстановах і агітацыйных пікетах, вы таксама знойдзеце мяне ва ўсіх сацыяльных сетках, я адкрыты да плённага супрацоўніцтва з кожным на карысць нашай радзімы.

# БЫЧКОЎСКІ ВАЛЕРЫЙ ВАСІЛЬЕВІЧ



**Праграма кандыдата ў дэпутаты па Заходняй выбарчай акрузе № 102.**

**«За адказныя рэформы з новым парламентам!»**

Шаноўныя беларусы!

Для мяне як хрысціянскага дэмакрата важна, каб у нашых сем'яў, нашых нашчадкаў была ўпэўненасць у будучыні.

**Як забяспечыць развіццё Беларусі?**

Беларускія хрысціянскія дэмакраты сумесна з сусветнымі экспертамі распрацавалі шэраг праектаў адказных рэформаў у заканадаўстве, эканоміцы, палітыцы, адукацыі, медыцыне, забудове местаў і інш.

**ЭКАНОМІКА ВЕДАЎ: інвестыцыі і працоўныя месцы з годным заробкам**

✓ Прыцягненне сродкаў эмігрантаў і замежных інвестараў у новыя сектары эканомікі (IT-індустрыя).

✓ Развіццё малога і сярэдняга бізнесу: адмена сертыфікатаў; існуючых штрафаў і праверак; найм работнікаў без абмежаванняў; незалежныя суды; беспрацэнтныя пазыкі на адкрыццё сямейнага бізнесу.

✓ Падатковыя канікулы на 5 гадоў для новых прадпрыемстваў і 10 гадоў для сямейнага бізнесу.

✓ Беспрацэнтныя крэдыты для сямейнага бізнесу на 10 гадоў.

✓ Адмена датацый дзяржсектару і прыватызацыя стратных прадпрыемстваў.

**АДУКАЦЫЯ: еўрапейскі ўзровень і эканоміка ведаў**

✓ Прэстыж і павага да настаўнікаў: заробак на 10 % вышэйшы за сярэдні; скарачэнне адміністрацыйна-дакументальнай і няпрофільнай нагрузкі; празрыстасць прэміравання.

✓ Скарачэнне райаддзелаў адукацыі, празрыстая справаздачнасць аб фінансах і выдатках школ, забарона пабораў з бацькоў.

✓ Беспрацэнтныя IT-крэдыты на адукацыю і перакваліфікацыю.

✓ 1000+: беззваротная аднаразовая дапамога з бюджэту маладым спецыялістам (<25), бясплатнае жыллё на 2 гады пры добраахвотным размеркаванні.

✓ Адтэрміноўка ад войска для кожнай прыступкі адукацыі: сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, магістратуры і аспірантуры.

✓ Акадэмічная свабода і спрошчаная акрэдытацыя для прыватных ВНУ. Стварэнне беларускамоўнага ўніверсітэта. Выбар студэнтам часткі курсаў. Інтэграцыя адукацыі і рынку працы. Добраахвотнае размеркаванне.

**ЗАБУДОВА ГАРАДОЎ: камфорт, бяспека і экалагічнасць**

✓ Выбары мэраў гарадоў, рашаючы голас жыхароў пры размеркаванні бюджэту і планах па забудове.

✓ Разбудова сацыяльнай інфраструктуры ў новых мікрараёнах: школ, дзіцячых садкоў і паліклінік.

✓ Перанос шкодных вытворчасцяў на бяспечную адлегласць ад гарадоў.

✓ Забарона празмернага ўшчыльнення гарадоў, зносу прыватнага сектара, высечкі паркаў і сквераў.

**ВЫБАРЧАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА: празрыстыя і дэмакратычныя выбары**

✓ Забяспечыць назіральнікам безбар'ерны доступ да ўсіх этапаў выбарчага працэсу, уключаючы работу камісіяў, зверку подпісаў і іншых дакументаў кандыдатаў, праверку спісаў выбарцаў і пратаколаў галасавання.

✓ Праводзіць датэрміновае галасаванне з тымі ж захадамі бяспекі, што і ў асноўны дзень выбараў, у тым ліку патрабаванні пра наяўнасць на ўчастку кворуму чальцоў выбаркама і абвяшчэнне лічбаў яўкі па кожным дні.

✓ Празрысты падлік галасоў з абвяшчэннем зместу кожнага бюлетэня пры ўсіх прысутных на ўчастку.

✓ Перагледзець існуючае заканадаўства, каб «забяспечыць роўныя правы для кандыдатаў, сапраўдную канкурэнцыю, свабоднае волевыяўленне выбарцаў і цэльнасць выбарчага працэсу».

✓ Для павышэння празрыстасці вынікі выбараў мусяць абвяшчацца з разбіўкай па выбарчых участках і паасобку для кожнага кандыдата. Яны мусяць уключаць колькасць галасоў «супраць усіх», а таксама колькасць сапраўдных, несапраўдных і сапсаваных бюлетэняў.

**АСТРАВЕЦКАЯ АЭС: не новаму Чарнобылю**

✓ Адмовіцца ад запуску атамнага рэактара.

✓ Перапрафіляваць пры падтрымцы ЕС атамныя магутнасці станцыі на газавыя.

Выступім разам — **За** незалежную Беларусь, **За** празрыстыя дэмакратычныя выбары, **За** ліквідацыю атамнай пагрозы для Беларусі, **За** адказныя рэформы дзеля годнай будучыні нашых дзяцей, **За** новыя працоўныя месцы з годным заробкам і пенсіямі, **За** камфортнае і бяспечнае наваколле, **За** нацыянальную памяць і нацыянальную годнасць, **За** змену аўтарытарнага самаўладдзя на дэмакратычную ўладу!

**ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!**

***Абараніце свой выбар — удзельнічайце ў незалежным назіранні! Кантактны тэл.: 8-029-167-34-35, bchd.info@gmail.com, http://bchd.info***

# Кандыдацкі інтэнсіў у фармаце маладзёжнага кватэрніка

**Яго ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі БРСМ — кандыдаты ў дэпутаты беларускага парламента.**

Кандыдаты падзяліліся прапановамі па сацыяльнай абароненасці маладых сем'яў і маладых спецыялістаў, закранулі тэмы замацавання моладзі на вёсцы, жыллёвага будаўніцтва, развіцця маладзёжнага прадпрымальніцтва, а таксама надання асаблівага статусу валанцёраў і прыняцця закона аб абароне хатніх жывёл. З улікам агульнасусветнай тэндэнцыі кандыдаты ў дэпутаты сёмага склікання абмеркавалі і пытанне павелічэння парога маладзёжнага ўзросту. Таксама было адзначана, што ў выпадку абрання актывісты БРСМ актыўна зоймуцца стварэннем магутнага кадравага рэзерву, у які ўвойдуць падрыхтаваныя, кваліфікаваныя маладыя людзі, здольныя генераваць і развіваць заканадаўчыя ідэі.

Прадстаўнікі каманды БРСМ падкрэслілі, што цяпер ідзе актыўная фаза агітацыйнай кампаніі, і ўсе яны, штодня сустракаючыся з насельніцтвам, вывучаюць праблемныя пытанні. Прысутныя звярнулі ўвагу на тое, што выбаршчыкі хочуць бачыць у парламенце энергічных дэпутатаў, здольных чуць народ, быць бліжэй да людзей.

— Мы правялі нефармальную сустрэчу. Гэта былі вельмі шчырыя стасункі. Хлопцы і дзяўчаты расказалі, з якімі ініцыятывамі ідуць у парламент. І што вельмі важна, кожны адзначыў, што на першым месцы — людзі, — паведаміў па выніках маладзёжнага кватэрніка **першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Дзмітрый ВАРАНЮК.**

Па выніках электаральнай кампаніі — 2019 БРСМ разлічвае на стварэнне ў парламенце маладзёжнай групы. На дэпутацкія мандаты ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання прэтэндуюць дзесяць членаў Саюза моладзі. Яны былі вылучаны кандыдатамі, як шляхам збору подпісаў, так і працоўнымі калектывамі, палітычнымі партыямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Моладзь у падтрымку выбараў

**Сёння Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі правядзе ў рэгіёнах краіны і ў Мінску больш за сто маладзёжных пікетаў, скіраваных на павышэнне электаральнай актыўнасці выбаршчыкаў падчас выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.**

Маладзёжная кампанія БРСМ, якая стартавала 26 кастрычніка, заклікана стымуляваць цікавасць беларусаў да адной з галоўных грамадска-палітычных падзей года.

Маладзёжныя пікеты будуць праводзіцца да 16 лістапада ўключна па суботах. Кожны пікет — гэта новая прыкметная і крэатыўная пляцоўка, на якой актывісты арганізацыі будуць агітаваць землякоў выканаць 17 лістапада свой грамадзянскі абавязак. У Цэнтральным камітэце БРСМ падкрэслілі, што маладзёжныя пікеты не маюць дачынення да перадвыбарнай агітацыйнай гонкі.

Акрамя таго, на будучым тыдні БРСМ правядзе больш за 120 электаральных мерапрыемстваў для моладзі: адкрытыя дыялогі «Беларусь і Я», дзелавыя гульні «Азбука грамадзяніна», «Прававы лабірынт», школы маладога выбаршчыка, акцыі «Мой ідэальны дэпутат», віктарыны «Будучы выбаршчык» і іншыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ідэі і рашэнні

# ТЭХНАЛОГІІ ПЕРАЎТВАРЫЛІ СКВЕР

**Вы ўяўляеце, як выглядае звяно палімера? А дзеці, якія гушкаюцца на арэлях у скверы каля Інстытута механікі металапалімерных сістэм у Гомелі, цяпер уяўляюць. Зараз іх не выцягнуць з гэтага незвычайнага прыстасавання, якое да таго ж свеціцца рознымі колерамі ўвечары.**


Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Святлодыёдныя арэлі — не адзіная «фішка», якую прыдумала група студэнтаў кафедры «Архітэктура і будаўніцтва» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту на чале з кіраўніком творчай лабараторыі Алай Пацкевіч. Ідэі маладых людзей былі прызнаны найлепшымі па выніках конкурсу праектаў па добраўпарадкаванні Цэнтральнага раёна Гомеля. Ну а спецыялісты інстытута «Гомельпраект» прафесійна агранілі і дапрацавалі знаходкі маладых.

Юнакі і дарослыя адразу ж ацанілі свабодную зону wi-fi, наяўнасць якой можна вызначыць па адпаведных сімвалах на лаўках. Яны ж абсталяваны сонечнымі батарэямі. На працягу дня гэтыя прылады назапашваюць энергію, што дазваляе падзарадзіць гаджэт. Ёсць тут і лаўка, якая «спявае». Слухаць музыку можна, калі падключыцца да яе з дапамогай Bluetooth-гарнітуры. Яшчэ ў скверы з'явіліся незвычайныя кветнікі і вулічныя ліхтары з рэжымамі падсвятлення, якія пастаянна мяняюцца. Цяпер тут нават кадкі з туямі выпраменьваюць святло.

Пры гэтым ніводнае дрэва пры рэканструкцыі не было знішчана. Захаванне зялёнай зоны ў поўным аб'ёме было адной з умоў рэканструкцыі.

Дарэчы, у арыгінальнай канцэпцыі аўтарамі закладзена філасофія: цяпер праз сквер, які знаходзіцца якраз насупраць Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, быццам праходзіць дарога-рака — па ёй маладыя людзі ўваходзяць у жыццё, атрымліваючы найлепшае ад папярэдніх пакаленняў. Тут захавана трасіроўка пешаходных сцяжынак: яны пратаптаны людзьмі за многа гадоў і сталі звыклыя для руху. Пры гэтым аднаўленыя пешаходныя дарожкі выбрукавалі прыгожай рознакаляровай пліткай.

Шматлікія элементы добраўпарадкавання ўжыты ўпершыню. Іх рэалізоўвалі адміністрацыя Цэнтральнага раёна і прадпрыемствы абласнога цэнтра, у тым ліку «Гомельгарсвятло» і «Чырвоны гваздзік». Сквер, які яшчэ нядаўна быў змрочны, адразу ж ажывіўся і напоўніўся гоманам дзяцей і падлеткаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Па чутках. І па сутнасці

# 50 кіламетраў у гадзіну

## БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

**Нельга сказаць, што агучаная адносна нядаўна прапанова знізіць дазволеную хуткасць руху ў населеных пунктах краіны да 50 кіламетраў у гадзіну падзяліла грамадства на два лагеры. Але тэма актыўна дыскутуецца ў асяроддзі кіроўцаў. Выказваюцца розныя пункты погляду.**

Сваёй кампетэнтнай думкай на гэты конт падзяліўся прадстаўнік ДАІ краіны ў час работы канферэнцыі па выніках «Еўрапейская тыдня мабільнасці — 2019», прысвечанага стварэнню бяспечных пешых і веласіпедных маршрутаў у вялікіх і малых гарадах. Паводле слоў **начальніка аддзела арганізацыі дарожнага руху і дарожнай інспекцыі УДАІ МУС Беларусі Дзмітрыя НАВОЯ,** у яго калег ёсць разуменне таго, што сёння зрабіць 50 км/г на той вулічна-дарожнай сетцы, якая ў асноўным склалася яшчэ пры Савецкім Саюзе, вельмі складана.

Нават калі ўявіць, што ў Мінску ў гадзіну пік дазволяць аўтамабілям рухацца з хуткасцю аж 100 км/г, рэальная сярэдняя хуткасць будзе ўсё роўна ў межах 12—18 кіламетраў у гадзіну. Пробкі, заторы, святлафоры... Цяпер рыхтуюцца прапановы па структурызацыі ў краіне вулічна-дарожнай сеткі, якія ўлічваюць усе абставіны і ўмовы руху. Мяркуецца на асобных дарогах і вуліцах дазволіць рухацца з хуткасцю 70, 50 і 30 кіламетраў у гадзіну. Там, дзе дазволяць 50 км/г, прыярытэт будзе за змешаным трафікам: гарадскім грамадскім транспартам, веласіпедамі. На трасах з абмежаваннем 30 км/г аўтамабіль будзе на апошнім месцы: прыярытэт — за веласіпедамі.

Дарэчы, на думку Дзмітрыя Навоя, узнікае шмат аб'ектыўных цяжкасцяў і праблем па арганізацыі правільнага веласіпеднага руху. Гэтая работа вядзецца з улікам найлепшага міжнароднага досведу — напрыклад, па стварэнні веласіпедных пераездаў цераз дарогі. Таксама запланаваны сустрэчы УДАІ МУС з прадстаўнікамі веласіпеднай супольнасці Мінска, іншых гарадоў. А на пытанне, ці будзе 50 кіламетраў у гадзіну, прадстаўнік ДАІ параіў пачакаць канчатковага рашэння.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Знакавая філатэлія

# НАШЫ ГРОШЫ НА МАРКАХ

**У панядзелак, 4 лістапада, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі нашай краіны выпускае ў абарачэнне паштовыя маркі «Гісторыя грашовых знакаў Беларусі».**

Паштовы праект, які складаецца з трох паштовых марак, канверта «Першы дзень» і спецыяльнага штэмпеля, падрыхтаваны РУП «Белпошта» і Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі ва ўзаемадзеянні з Нацыянальным банкам Беларусі.

На паштовых марках прадстаўлены грашовыя знакі Рэспублікі Беларусь узору 1992—1999 гадоў, а таксама 2000 года і 2009 года. Тыраж кожнай маркі складае 72 000 паасобнікаў. Маркі таксама аддрукаваныя ў малым лісце тыражом 15 000 паасобнікаў. У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (магазін «Філатэлія», вуліца Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

**Сяргей КУРКАЧ.**



# СПЫНІЦЬ НЕБЯСПЕЧНЫ ВІР

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Ад 2014 года колькасць нарказлачынстваў істотна зменшылася — у паўтара раза. Сёлета іх за першыя дзевяць месяцаў года зафіксавана 3579. Ад 2014 года, калі пачаў дзейнічаць Дэкрэт № 6, рэзка ўпала колькасць непаўналетніх фігурантаў спраў, якія датычацца забароненых рэчываў, — у шэсць разоў.

Што да передазіровак са смяротным вынікам, то летась іх у краіне было зарэгістравана 30. У пераліку на 1 мільён чалавек ва ўзросце 15—64 гадоў гэты паказчык складае 4,6. Па звестках Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, ён у 14 разоў меншы за літоўскі, у 17 — за расійскі і ў 72 — за амерыканскі. Апошні выпадак, калі ад передазіроўкі наркотыкаў памёр непаўналетні, быў і наогул у 2014 годзе.

Але тым, што Беларусь — краіна транзітная, актыўна карыстаюцца і наркагандляры.

— Колькасць канфіскаваных наркотыкаў і псіхатропаў павялічваецца паступальна з 2014 года, — працягвае Генадзь Казакевіч. — Гэта як «транзітныя» рэчывы, так і тыя, што распаўсюджваюцца ўнутры краіны. Прычым да названых вышэй лічбаў трэба дадаць яшчэ 1800 кілаграмаў, якія канфіскавалі нашы калегі ў Літве, Латвіі, Польшчы на знешніх межах нашай дзяржавы. Усё гэта прызначалася альбо для Беларусі, альбо для перавалкі ў напрамку Расіі.

Істотна змянілася і характарыстыка наркарынку. Калі ў 2014 годзе баль правілі сінтэтычныя наркотыкі, то цяпер 80 % рынку прыходзіцца на долю марыхуаны і гашышу. Лагістычны ланцужок выбудаваны наступным чынам: Заходняя Афрыка — Еўрасаюз — транзітам праз Беларусь у Расію.

Найбуйнейшая партыя наркотыкаў, якую канфіскавалі супрацоўнікі міліцыі сёлета, была адлоўлена на граніцы Беларусі і Латвіі. Там знайшлі 10 кілаграмаў MDMA, 5 кілаграмаў мефедрону, 112 кілаграмаў гашышу і 4 кілаграмы какаіну. Усё гэта накіроўвалася ў Расію.

Рухаюцца наркотыкі і ў адваротным напрамку. Злачынныя групоўкі, у якія ўваходзяць выхадцы з Таджыкістана, Турцыі і Ірана, спрабуюць аднавіць пастаўкі афганскага гераіну па так званым паўночным маршруце транзітам праз Расію і Беларусь у Заходнюю Еўропу. Наркотыкі з-за мяжы паступаюць па наладжаных каналах. Яны ўключаюць у сябе прадуманую лагістыку і арганізаваныя злачынныя групы, якія і перамяшчаюць смяротныя рэчывы. Сёлета беларускія праваахоўнікі спынілі дзейнасць 20 такіх каналаў.

Разам з тым МУС адзначае пэўныя негатыўныя тэндэнцыі ўнутры самой Беларусі.

— Па-першае, 95 % наркотыкаў і псіхатропаў распаўсюджваецца закладкамі праз інтэрнэт, — кажа Генадзь Казакевіч. — У тэхнічным плане выявіць такія злачынствы вельмі складана. Але работа гэтая неабходная, інакш наркатычны вір будзе зацягваць у сябе ўсё больш і больш людзей. Таму была створана цэлая сістэма інтэрнэт-разведкі. Сотні сайтаў, якія мелі дачыненне да наркарынку, трапілі пад блакіроўку. Закрываліся і інтэрнэт-крамы...

Яшчэ адна пагроза ў тым, што павялічваецца латэнтнасць наркаманіі. Афіцыйная колькасць нарказалежных, якія стаяць на ўліку, складае каля 13 тысяч чалавек. Рэальная іх колькасць, па ацэнках ведамства, — гэта 88 з паловай тысяч. Сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што пераважная большасць з іх — эканамічна актыўныя грамадзяне. Чаму ж існуе такая вялікая вілка? Ёсць шэраг абмежаванняў, звязаных з працаўладкаваннем наркаспажыўцоў. І сама сістэма дзяржаўнай наркалогіі, на погляд міністэрства, мае патрэбу ва ўдасканаленні.

— МУС выступіла з шэрагам ініцыятыў, — кажа суразмоўца. — Першая звязана са стварэннем новага рэсурсу pomogut.by, дзе змешчана ўся неабходная інфармацыя для дзяцей, бацькоў і настаўнікаў. Міністэрства адукацыі падтрымала прапанову сілавога ведамства зрабіць гэты рэсурс часткай навучальнага працэсу. Другая датычылася стварэння спецыяльнага цэнтра, дзе нарказалежных будуць праходзіць праз працяглую рэабілітацыю.



Прадстаўнік МУС таксама пракаментаваў адзін з самых масавых працэсаў за апошні час, звязаных з распаўсюджваннем наркотыкаў. Больш за тры гады гэтай справай займаліся міліцыя і Следчы камітэт. Сярод яе фігурантаў былі ажно 37 чалавек, якія атрымалі вялікія тэрміны.

— Гэта была вельмі працаёмкая рэч. Але мушу зазначыць, што ўсё пачынаецца з работы падраздзяленняў інтэрнэт-разведкі. Першае, што мы робім, — выяўляем дзейнасць так званых крам. Затым збіраем па іх інфармацыю, праводзім аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы ў інтэрнэце. Мы выяўляем не проста спажыўцоў і закладчыкаў, наша задача — злавіць арганізатараў.

Саміх жа закладчыкаў — як правіла, маладых людзей — дылеры клічуць «мясам». Фактычна для арганізатараў злачыннага гандлю гэта жывы расходны матэрыял. Пры гэтым яны цудоўна разумеюць, на што ідуць, — усё-такі апошнія шэсць гадоў пра жорсткую адказнасць за незаконны гандаль наркотыкамі расказваюць, як той казаў, дзе толькі магчыма. Але прага вялікіх грошай пры абяцанай лёгкасці работы засціае вочы. Ды і самі дылеры расказваюць пра тое, што могуць забяспечыць ананімнасць. Кліент гэтаму верыць. Пачынае раскладваць наркотыкі — і ў нейкі момант «работа» перапыняецца нечаканым, але заслужаным адпраўленнем за краты.

— І ў нас узнікае простае пытанне: а дзе ж бацькі? — працягвае Генадзь Казакевіч. — Чаму яны функцыі выхавання дзяцей перакладваюць на МУС? Гэта ўсё роўна, што, напрыклад, у тым, што дзіця дрэнна вучыцца, абвінавачваць Міністэрства адукацыі. Але гэта ж бязглуздзіца.

Разам з тым пад сёлетнюю амністыю трапіць каля 1600 асуджаных па частках 1, 2, 3 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса. Ім скароцяць тэрмін на год. А непаўналетнім — на два.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

| | |
|---|---|
| **ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**<br>✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**<br>✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения** |

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (магазин № 9) с инв. № 350/С-85625, площадью 326,3 кв. м (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное основное строение, одноэтажная блочная пристройка, навес с эстакадой, навес), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 275;<br>– охранно-пожарная сигнализация (инв. № 22358);<br>– капитальное строение (сарай металлический магазина № 9) с инв. № 350/С-202808, площадью 72,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 275/1;<br>объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006135 площадью 0,1031 га. Цель использования – розничная торговля продовольственными товарами | **592 000,00** | **59 200,00** |
| 2 | – Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-342471 площадью 124,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Белого В. А., 52А-3.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006319 площадью 0,0773 га. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами и общественное питание | **295 000,00** | **29 500,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 18 ноября 2019 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **20 ноября 2019 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф.2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете *«Звязда» от 02.11.2019 г.* |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. **Победителю аукциона по Лоту № 1 и по Лоту № 2 предоставляется рассрочка платежа на 3 (три) месяца**. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

---

Печать частного торгового унитарного предприятия «Натлис» (УНП 691586563) считать недействительной в связи с утерей.

---

Страховой полис ОСГО ВТС РБ серии НА № 0672132 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным в связи с утерей.** УНП 100357923

---

## Унитарное предприятие «Молодечненский пищевой комбинат» объявляет аукцион

Организатор торгов: Антикризисный управляющий ООО «Бизнесарсенал» Волынец Антон Игоревич, тел. 8 029-6213137

Продавец: **Унитарное предприятие «Молодечненский пищевой комбинат»** (УНП 600078150), ул. Л. Роменская, 62, 222310, г. Молодечно. Тел. 0176-777617, факс 0176-770484, e-mail: **molodechnopk@mail.ru**

Торги будут проведены в форме открытого аукциона в электронной форме на электронной торговой площадке **https://bankrot.gov.by: 5 декабря 2019 г. 10.00.**

Предмет торгов представляет собой движимое имущество должника (промышленное оборудование и др.) и состоит из **156 лотов (**ЛОТЫ Разделяемые), перечень лотов находится на сайте **https://bankrot.gov.by**: Местонахождение предмета торгов – Минская область г. Молодечно, **ул. Либаво-Роминская, 62.**

**Прием заявок: с 2 декабря 2019 г. 9.00 по 4 декабря 2019 г. 16.00**

| ЛОТ | Предмет торгов | Начальная цена, с НДС (20 %) бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот №№ 1, 2** | Трансформатор, 1981 г. в., инв. 40 (в кол-ве 2 шт.) | 1 500,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 3** | Бетономешалка, 1987 г. в., инв. 312 | 70,00 |
| **Лот № 4** | Станок круглопильный, 1985 г. в., инв. 310 | 1200,00 |
| **Лот № 5** | Измеритель влажности, 2007 г. в., инв. 180 пмк | 10,00 |
| **Лот № 6** | Универсальный фрезерный станок, 1981 г. в., инв. 67 | 1 700,00 |
| **Лот № 7** | Радиально-сверлильный станок, 1982 г. в., инв. 68 | 800,00 |
| | **ЦЕХ Розлива** | |
| **Лот № 8** | Пресс для отжима, 1974 г. в., инв. 254 | 80,00 |
| **Лот № 9** | Сборник, 1983 г. в., инв. 127 | 50,00 |
| **Лот № 10** | Мерник-сборник, 1991 г. в., инв .1258 | 90,00 |
| **Лот № 11** | Сборник СЗ-100, 1989 г. в., инв. 229 | 50,00 |
| **Лот № 12** | Бракераж, 1981 г. в., инв. 431 | 70,00 |
| **Лот № 13** | Мерник-сборник, 1977 г. в., инв. 137 | 90,00 |
| **Лот № 14** | Реактор (пастеризатор),1987 г. в., инв. 228 | 100,00 |
| **Лот № 15** | Подогреватель теплообменный, 1987 г. в., инв. 266 | 100,00 |
| **Лот №№ 16, 17** | Принтер «Виллет» 3820, 1996 г. в., инв. 293 (в кол-ве 2 шт.) | 10,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 18** | Насос К-45, 1998 г. в., инв. 302 | 30,00 |
| **Лот № 19** | Электр.-система учета БУС, 2002 г. в., инв. 752 | 5,00 |
| **Лот № 20** | Машина фасовочная Д9-ВРЕ-6, 2006 г. в., инв. 1071 | 2 100,00 |
| **Лот № 21** | Автомат укупорочный, 2006 г. в., инв. 1080 | 1 800,00 |
| **Лот № 22** | Транспортер бутылочный, 2006 г. в., инв. 1081 | 800,00 |
| **Лот №№ 23, 24** | Система учета ЭСУ-М, г. в. 2006, инв. 1083 (в кол-ве 2 шт.) | 5,00 (за 1 шт.) |
| **Лот №№ 25, 26** | Транспортер напольный горизонт, 2011 г. в., инв. 1278 (в кол-ве 2 шт.) | 800,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 27** | Автомат для наклеивания марки А07-1, 2015 г. в., инв. 1337 | 1 188,00 |
| | **Консервный цех** | |
| **Лот № 28** | Компрессор, 1994 г. в., инв. 223 | 200,00 |
| **Лот № 29** | Насос, 1997 г. в., инв. 295 | 50,00 |
| **Лот № 30** | Насосная установка, 1998 г. в., инв. 535 | 100,00 |
| **Лот № 31** | Силосорезка, 1976 г. в., инв. 198 | 100,00 |
| **Лот № 32** | Компрессор, 1997 г. в., инв. 296 | 200,00 |
| **Лот № 33** | Вакуум «Аппарат», г. в. 1985, инв. 331 | 100,00 |
| **Лот № 34** | Варочный котел МЗС-244А, 1988 г. в., инв. 465 | 1 200,00 |
| **Лот № 35** | Плита паровая, 1990 г. в., инв. 476 | 1 200,00 |
| **Лот № 36** | Реактор МЗ-2, 1990 г. в., инв. 501 | 400,00 |
| **Лот № 37** | Машина закаточная, 1992 г. в., инв. 510 | 2 100,00 |
| **Лот № 38** | Машина МПР-350, 2000 г. в., инв. 643 | 2 100,00 |
| **Лот № 39** | Роторно-пусьсационный насос, 2001 г. в., инв. 717 | 50,00 |
| **Лот № 40** | Насос Ж-6, 2001 г. в., инв. 720 | 50,00 |
| **Лот № 41** | Установка насосная ВЦН-20, 2002 г. в., инв. 755 | 100,00 |
| **Лоты №№ 42, 43** | Отопительный агрегат, 2003 г. в., инв. 767 (в кол-ве 2 шт.) | 50,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 44** | Автомат дозировочно-наполнитель, 2005 г. в., инв. 971 | 1 000,00 |
| **Лот №№ 45–47** | Агрегат эл/нас ОНЦ-1-25/32, 2005 г. в., инв. 1015 (в кол-ве 3 шт.) | 50,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 48** | Овощерезка ОР-1, 2005 г. в., инв. 1027 | 110,00 |
| **Лот № 49** | Насос вакуумный ВВН-1-3, 2006 г. в., инв. 1066 | 50,00 |
| **Лот № 50** | Машина этикировачноя А1-ВЭ2С, 2006 г. в., инв. 1070 | 1 200,00 |
| **Лот № 51** | Емкость вертикальная, 2006 г. в., инв. 1089 | 200,00 |
| **Лот № 52** | Весы всп-300/50-8, 2009 г. в., инв. 1203 | 60,00 |
| **Лот № 53** | Резервуар для пищ. жидкостей РНВО-1,8, 2009 г. в., инв. 1207 | 780,00 |
| **Лот № 54** | Насос молочный Г2-ОПА, 2009 г. в., инв. 1209 | 132,00 |
| **Лот № 55** | Установка Экософт-МО, 2009 г. в., инв. 1212 | 500,00 |
| **Лот № 56** | Наполнитель Б4-КН 51, 2012 г. в., инв. 1285 | 1 000,00 |
| | **Мясной цех** | |
| **Лот №№ 57, 58** | Холодильная установка, 1985 г. в., инв. 112 (в кол-ве 2 шт.) | 20,00 (за 1 шт.) |
| | **Соковый цех** | |
| **Лот №№ 59–66** | Емкость для сока, г. в. 1973, инв. 621 (в кол-ве 10 шт.) | 1 500,00 (за 1 шт.) |
| **Лот №№ 67–88** | Опора к танкам, 1984, инв. 217 (в кол-ве 22 шт.) | 15,00 (за 1 шт.) |
| **Лот №№ 89, 90** | Емкость для сока, 1989 г. в., инв. 230 (в кол-ве 2 шт.) | 1 200,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 91** | Насос КМ, 1996 г. в., инв. 373 | 50,00 |
| **Лот № 92** | Емкость 20 м³, 2007 г. в., инв. 1147 | 1 600,00 |
| **Лот №№ 93, 94** | Емкость 25м³, 2007 г. в., инв. 1149 (в кол-ве 2 шт.) | 1 600,00 (за 1 шт.) |
| **Лот №№ 95–105** | Емкость18 м³, 2007 г. в., инв. 1155 (в кол-ве 11 шт.) | 1 500,00 (за 1 шт.) |
| **Лот №№ 106–109** | Емкость 12,5 м³, 2007 г. в., инв. 1164 (в кол-ве 4 шт.) | 1 400,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 110** | Машина моечно-встряхивающая, 2010 г. в., инв. 1236 | 120,00 |
| | **Купажное** | |
| **Лот № 111** | Фильтр-пресс В9-ВФС, 1981 г. в., инв. 179 | 200,00 |
| **Лот № 112** | Мерник К7-ВМА, 1972 г. в., инв. 200 | 500,00 |
| **Лот № 113** | Холодильник «Ашерон», 1984 г. в., инв. 88 | 50,00 |
| **Лот №№ 114–152** | Емкость вертикальная 10 м³, 2006 г. в., инв. 1090 (в кол-ве 39 шт.) | 400,00 (за 1 шт.) |
| **Лот № 153** | Танк для вина Т19072 25 м³, 2011 г. в., инв. 1272 | 1 600,00 |
| | **Спиртохранилище** | |
| **Лот №№ 154–156** | Мерник технический, 1982 г.в., инв. 234 (в кол-ве 3 шт.) | 500,00 (за 1 шт.) |

Контактный телефон для ознакомления и осмотра в рабочие дни по предварительному согласованию по тел. +37529 356 81-04, Виталий Николаевич.

1) Перечислить задаток по выбранному лоту на расчетный счет продавца **унитарного предприятия «Молодечненский пищевой комбинат»,** р/с BY73BAPB30123339400100000000 в ЦБУ № 532 ОАО «Белагропромбанк», в Региональной дирекции по Минской обл., код BAPBBY2X, УНП 600078150, назначение платежа – задаток за участие в торгах по лоту №, тел. 0176-777617, факс 0176-770484; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **bankrot.gov.by;** 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: **molodechnopk@mail.ru** (подробнее – в информации лота на сайте **bankrot.gov.by**).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем электронных торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

### Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» в составе:

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение (корпус № 1, инв. № 610/D-56419**, *общая площадь – 6020,4 м², расположенное по адресу:* Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/26-1 | 220 525,50 | 22 052,00 |
| 2 | **Изолированное помещение (корпус № 2, инв. № 610/D-56428**, *общая площадь – 9599,0 м², расположенное по адресу:* Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/27-1 | 385 710,00 | 38 571,00 |
| 3 | **Капитальное строение (пристройка к корпусу № 1 (изготовление футора), инв. № 610/С-53920, общая площадь – 1535,4 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001098 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/23 | 139 191,00 | 13 919,00 |
| 4 | **Капитальное строение (цех сувениров, инв. № 610/С-53934, общая площадь – 290,2 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001105 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/12 | 25 825,80 | 2 582,00 |
| 5 | **Изолированное помещение (цех ширпотреба, инв. № 610/D-56375, общая площадь – 1872,6 м²)**, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/19-1 | 181 116,00 | 18 111,00 |
| 6 | **Капитальное строение (цех металлодеталей, общая площадь – 1924,9 м²)**, **капитальное строение (здание растворно-бетонного узла, инв. № 610/С-53921, общая площадь – 20,3 м²)**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001099 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/3 | 96 092,10 | 9 609,00 |
| 7 | **Капитальное строение (РМЦ, инв. № 610/С-53918, общая площадь – 1161,2 м2)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001097 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/18 | 62 384,40 | 6 238,400 |
| 8 | **Капитальное строение (прирельсовый склад хранения лаков и красок, инв. № 610/С-53946, общая площадь – 424,3 м²)**, **капитальное строение (станция перекачки, инв. № 610/С-53944, общая площадь – 41,8 м²)**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001118 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36, корп. 10 | 40 315,08 | 4 031,00 |
| 9 | **Капитальное строение (склад готовой продукции, инв. № 610/С-53933, общая площадь – 717,0 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001104 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/11 | 56 095,65 | 5 609,00 |
| 10 | **Капитальное строение (сушильно-раскроечный цех**, общая площадь – 2023,5 м²), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36Г | 88 881,00 | 8 888,00 |
| 11 | **Капитальное строение (лесопильный цех, общая площадь – 538,9 м²),** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001105 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/13 | 38 906,40 | 3 890,00 |
| 12 | **Капитальное строение (электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная, инв. № 610/С-53929, общая площадь – 639,2 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001095 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/17 | 39 744,90 | 3 974,00 |
| 13 | **Капитальное строение (бойлерная, инв. № 610/С-53925, общая площадь – 43,7 м²)**, **сооружение (навес для ПВМ, инв. № 610/С-53940, площадь – 45 м²),** расположенные на земельном участке с кадастровым номером 640400000008000182 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/24 | 8 468,85 | 846,00 |
| 14 | **Капитальное строение (здание трансформаторной подстанции, инв. № 610/С-53943, общая площадь – 350,1 м²), капитальное строение (низконапорная станция перекачки сточных вод, инв. № 610/С-53941), сооружение (труба дымовая кирпичная, инв. № по бух. учету 20014**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002774 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36 | 81 750,10 | 8 175,00 |
| 15 | **Капитальное строение (насосная станция 1-го подъема, инв. № 610/С-53937, общая площадь – 94,8 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002787 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/6 | 5 903,04 | 590,00 |
| 16 | **Капитальное строение (насосная станция 2-го подъема, инв. № 610/С-53938, общая площадь – 63,1 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/4 | 8 586,24 | 858,00 |
| 17 | **Капитальное строение (пост приема и выдачи нефтепродуктов, инв. № 610/С-53945, общая площадь – 47,3 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002786 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/8 | 4 091,88 | 409,00 |

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

В соответствии с абзацем 4 п. 1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона (по лотам №№ 13, 15–18) и в размере 5 % (по лотам № 1–12, 14).**

**– имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем комиссионного вознаграждения банку за проведение данного платежа;**

**– на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата размещения сведений о торгах в СМИ.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяются условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **03.12.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **2.12.2019** до **17.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**Пуховичский районный исполнительный комитет проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь, который состоится 9 декабря 2019 г. в 15.00 в зале заседаний райисполкома, расположенном по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227.**

НА АУКЦИОН БУДУТ ВЫСТАВЛЕНЫ:

**Лот № 1.** Земельный участок (кадастровый номер 624450100001003861), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Кленовая, У-2.2, площадь – 0,0804 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, начальная цена – 13 378,56 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 1 337,86 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона, – 1 643,17 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения.

Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Титовка.

**Лот № 2.** Земельный участок (кадастровый номер 624484800029000019), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Пережирский с/с, СТ «Березка-2008», 71, площадь – 0,0981 га, для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Березка-2008», начальная цена – 2 266,11 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 226,61 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона, – 1 492,82 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения.

Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Свислочь, а также его части площадью 0,0053 га в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

**Лот № 3.** Земельный участок (кадастровый номер 624483400002000086), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, СТ «Горки-1», 76, площадь – 0,1000 га, для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Горки-1», начальная цена – 1 280,00 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 128,00 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона, – 1 012,51 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения.

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с № BY80AKBB36006250000250000000. Получатель: Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области Минского управления открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Минска, код банка AKBBBY2X, УНН 600537220, код платежа – 04901 (частная собственность).

**Участники аукциона должны представить следующие документы:**

– заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

– заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

**Кроме того, представляются:**

– гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

– представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, Пуховичский райисполком, 2-й этаж, к. 220 с 2 по 5 декабря 2019 г., с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

Заключительная регистрация – с 14.30 до 14.55 в день проведения аукциона по адресу: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227, зал заседаний райисполкома.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победитель аукциона вносит плату за землю; возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также в случае приобретения участка для строительства и обслуживания жилого дома получает разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, разрабатывает и утверждает строительный проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, выставленными на аукцион, путем выезда на место нахождения участка.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, к. 220, контактный тел. 8 01713 35879 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе**

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-14244 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – склад) общей площадью 949,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Минская, 103

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424350100001000523 площадью 0,1144 га (назначение – обслуживание зданий), расположенном по адресу: г. Новогрудок, ул. Минская, 103

**Начальная цена продажи – 31 040 руб. (тридцать одна тысяча сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 104 руб. (три тысячи сто четыре рубля)**

Продавец – ОАО «Кореличи-Лен», 231430, г. Кореличи, 8-01596-21-872

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.** Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.07.2019 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 15 ноября 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

# ДЗІВІНСКІ КРАЯЗНАВЕЦ

## Вясковы настаўнік-пенсіянер падараваў званы мясцоваму храму

**Гэта ж трэба, загадзя не ведаючы, прыехаць да свайго героя менавіта ў дзень яго 90-годдзя! У пярэднім пакоі накрыты стол, двор упрыгожаны гірляндамі з шароў, мабільны тэлефон ветэрана Афанасія Мікітавіча Гапановіча раз-пораз абвяшчае, што нехта з яго былых вучняў, калег, сваякоў, проста добрых знаёмых хоча павіншаваць вядомага, заслужанага чалавека. Адным словам, абстаноўка святочная.**


За работай.

### З БЕДНЯКА — У НАСТАЎНІКІ

Афанасій Мікітавіч валодае выдатным пачуццём гумару, чалавек па натуры рухавы, гаваркі і актыўны для сваіх гадоў. І ў гэтым давялося не раз упэўніцца за час размовы. На яго рабочым стале раскладзена шмат кніг, сшыткаў, газет. Відно, што чалавек знаходзіцца ў творчым працэсе. Дарэчы, не так даўно Афанасій Гапановіч выдаў кнігу па гісторыі Дзівіна. Ён і зараз не праходзіць міма цікавых звестак па краязнаўстве, гісторыі: збірае, занатоўвае. Таксама пасля выхаду на пенсію ў ветэрана з'явілася яшчэ адно хобі, ён пляце кошыкі, цукерачніцы, падстаўкі пад слоікі, бутлі, графіны. Яшчэ ён іграе на мандаліне і ўмее радавацца жыццю.

А жыццё было ўсялякае. Паводле слоў Афанасія Мікітавіча, ён нарадзіўся ў вельмі беднай сям'і дванаццатым па ліку дзіцем. Пасля яго быў яшчэ адзін брат. Але выгадавалася толькі шасцёра дзяцей, астатнія памерлі ў дзіцячым узросце. «Медыцынскай дапамогі не было, дзейнічаў натуральны адбор», — уздыхае пенсіянер.

— Што помню з дзяцінства? — пачынае ён свой расказ. — Працаваў, здаецца, з самых малых гадоў. Гэта ўжо падлеткам стаў араць, баранаваць, а малы найбольш кароў пасвіў. Уставаць даводзілася рана, прыйдзеш, бывала, позна ўвечары ды адразу ўпадзеш спаць. Хто там ногі мыў! Пасцель у асноўным была з сена. Так вось і жылі... Хадзіў найбольш у лапцях. Толькі ў 1947 годзе перад паступленнем у педвучылішча знайшоў нейкія нямецкія галёшы. Смяяліся з іх гарадскія аднакурснікі, але ж не я адзін такі быў. Ой, цяперашняму пакаленню і не раскажаш, не паверыць. Ва ўсіх нас колькі вопраткі, абутку, у халадзільніку ўсяго поўна. А ў маім дзяцінстве, калі быў кавалак сала да хлеба, гэта ўжо вельмі добра.

Бацька хацеў, каб я пайшоў у святары, але адзін са сваякоў параіў падавацца ў настаўнікі. І пасля доўгага роздуму я прыняў рашэнне. Можна сказаць, у адзін міг рашыў. А было вось так: мы з мамай жалі грэчку, я палец парэзаў, прыйшоў дадому з поля. Пачуў, што машына з лесам ідзе на Брэст, апрануў, што было лепшае, паклаў у торбу хлеба з салам і напрасіўся да кіроўцы ў спадарожнікі. А да гэтага, не паверыце, нават у Кобрыне ні разу не быў.

Вось прыехаў у Брэст, ужо надвячорак, трэба ж недзе начаваць. Дзейнічаў як вясковы жыхар, паспрабаваў да людзей папрасіцца, зайшоў у бяднейшую хату каля Кобрынскага моста. І не прагналі, паслалі мне ў сенцах, побач з казою. Раніцай прачнуўся: ні хлеба, ні сала няма. Пайшоў шукаць вучылішча, знайшоў яго, паступіў і... скончыў у 1951 годзе.

Там Афанасій пасябраваў з прыгожай аднагрупніцай Верай. І перад самым выпускам, каб паехаць у адну школу, яны вырашылі распісацца. Для гэтага жаніху спатрэбіўся 1 рубель і 50 капеек, каб заплаціць пошліну, а грошай не аказалася, давялося ў выкладчыка пазычыць. Не было ні вяселля, ні сведак, ні багатага стала, але ж пражылі з Верай Міхайлаўнай 60 гадоў у згодзе. Выгадавалі траіх дзяцей, усіх вывучылі.

— А тады маладымі мы атрымалі накіраванне ў Гарадзец Кобрынскага раёна. Далі мне чацвёрты клас, — успамінае далей Афанасій Мікітавіч. — А там пераросткі, 14—15 гадоў. Да парадку не прывучаныя, пачаў менавіта з усталявання жорсткай дысцыпліны, і бацькі мяне падтрымалі, бо дзеці ваенных гадоў былі нярэдка запушчаныя ў выхаванні.

### УСПАМІН ПРА ВАЙНУ

...У вайну мы шмат чаго перажылі. Сам не раз быў на краю гібелі. Недзе, мусіць, у 1942 годзе немцы з усіх бакоў акружылі Дзівін. Людзі падумалі, што будуць усіх знішчаць. І бацька пасадзіў мяне на каня, загадаў уцякаць у лес. Аказалася, ехаў ледзь не насустрач смерці, бо акупанты задумалі каварную рэч: яны стралялі ў тых, хто ўцякаў. Уцякаеш, значыць, баішся, значыць, партызан. Вось такая логіка была. Дык вось, куля зачапіла вуха майго каня, ён стаў, як укапаны. Давялося мне вяртацца дадому. Тады бацькі рашылі мяне схаваць у яме для бульбы. Пасадзілі, насыпалі зверху на дошкі зямлі, лісцем прыцерушылі. І праз некалькі гадзін я стаў там задыхацца ад недахопу паветра, добра, што бацька пачуў стогны.

Другім разам я ледзь не нарваўся на расстрэл. У нас мадзьяры стаялі. Каля суседняга хлява яны вінтоўкі паставілі, я рашыў адну ўкрасці і прыхаваць, падлетак жа, дурань яшчэ. І ўжо аднёс яе можа з паўкіламетра. Па дарозе сустрэў аднаго дзеда з нашай вёскі, ён стаў лаяць мяне: «Ты ж усю сям'ю пад расстрэл падвядзеш! Нясі назад хуценька!» Я і панёс, кухталёў надавалі, але, як бачыце, не забілі.

### «ЗАЙЦАМ» — НА САМАЛЁЦЕ

— У якія толькі гісторыі не трапляў па маладосці, — усміхаецца ветэран, — нават у турме пасядзеў, праўда, адну ноч, але ж страху нацярпеўся. І было гэта недзе ў 1947 ці 1948 годзе, адразу як паступіў у вучылішча. Уяўляеце, хацеў «зайцам» на самалёце пакатацца! Дадому ж хацелася ў выхадныя, транспарту ніякага не было. Аднойчы прыехаў, з Кобрына пешшу прыйшоў (35 кіламетраў. — **Аўт.**), а назад пехатою не хочацца. Дзівін жа быў райцэнтрам, пошту самалётам вазілі, кукурузнік такі, У-2, лётаў. Не раз бачыў гэтую працэдуру разгрузкі-загрузкі. Падводай прывозілі пісьмы, пасылкі, вазніца пераносіў груз у самалёт, потым ішоў у будку, дзе адпачываў лётчык, дакладваў, што загрузка скончана. Пакуль ён ішоў, я з-за куста скочыў у самалёт, схаваўся за тымі скрынямі ды і паляцеў у Брэст. Аэрадром быў недзе за цяперашнім чыгуначным вакзалам. Але вылезці з машыны непрыкметна не ўдалося. Мяне злавілі і даставілі ў турму як падазроны элемент. Дакументаў пры мне ніякіх не было, пакуль разабраліся, хто я ды што, ноч прайшла. А ранкам нейкі аператыўны работнік вывеў на двор і пад азадак нагой выпісаў напрамак. Так я пакінуў месца зняволення.

### РАБОТА, ДОМ, СЯМ'Я

— Ну а калі стаў настаўнікам, то зрабіўся, вядома, сур'ёзным чалавекам. Даводзілася і дырэктарам школы працаваць у дваццаць з невялікім гадоў. Завочна скончыў педінстытут, выкладаў матэматыку. Мы з Верай Міхайлаўнай працавалі ў розных школах Кобрынскага, Маларыцкага раёнаў, потым вярнуўся ў Дзівін у бацькоўскі дом. Паставілі адразу інспектарам райана, а калі скасавалі раён у 1959 годзе, перайшоў у школу, дзе і працаваў да пенсіі, — расказвае ветэран.

А Вера Міхайлаўна пакінула пра сябе добрую памяць у аднавяскоўцаў не толькі як настаўніца, але як кіраўнік народнага хору Дома культуры. У яе быў цудоўны голас, і сваёй любоўю да песні яна заражала навакольных. Дваццаць гадоў кіравала хорам у Дзівіне. Муж ва ўсім падтрымліваў жонку, нярэдка выступаў акампаніятарам. Разам з Верай Міхайлаўнай яны марылі падарыць мясцоваму храму званы. Задуманае ажыццявіў ужо адзін. У яе памяць.

Ужо восем гадоў, як Афанасій Мікітавіч застаўся адзін. На сцяне каля рабочага стала змешчаны здымкі жонкі, дзяцей, унукаў. Дзеці раз'ехаліся па ўсёй былой вялікай краіне. А ўнукі ёсць і ў далёкім замежжы. Усяго ў Афанасія Мікітавіча шэсць унукаў, восем праўнукаў, ёсць ужо адзін прапраўнук. З цяперашнімі сродкамі сувязі ўсе без праблем змаглі павіншаваць дзядулю з юбілеем.

Ушанаванне ветэрана наладзілі ў сельскім Савеце. Прыйшлі павіншаваць вучні са школы, работнікі Дома культуры, іншых дзівінскіх устаноў. Старшыня сельвыканкама Вера ПІКУЛА адзначыла заслугі пенсіянера-педагога ў напісанні гісторыі мястэчка Дзівін. Асабліва каштоўным, на яе думку, выглядае раздзел дарэвалюцыйнай гісторыі, бо падзеі тых часоў мала хто ведае. Афанасій Мікітавіч правёў вялікую работу, працаваў у архівах, перачытаў шмат літаратуры, запісаў успаміны старэйшага сваяка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

Асоба

## Уладзімір ЯНКОЎСКІ:

# «КУПАЛУ» Я ЗРАБІЎ ТАК, ЯК РАЗУМЕЮ І ЎМЕЮ»

**Пакуль краіна чакае фільм «Купала» — амбіцыйны праект Нацыянальнай кінастудыі пра лёс народнага паэта, — мы сустрэліся з яго аўтарам Уладзімірам Янкоўскім. Рэжысёр і акцёр са знакамітай сям'і — Уладзімір з'яўляецца сынам Расціслава Янкоўскага і пляменнікам Алега Янкоўскага — якраз займаецца пострадакшанам карціны, да таго ж на кінафестывалі «Лістапад», які адкрыўся ўчора, выступае ў якасці члена журы Асноўнага конкурсу ігравога кіно. Што гэта за чалавек — кінаман і меламан, які зрабіў сабе імя ў кліпмейкерстве і здымках рэкламы, зняў шэраг расійскіх фільмаў і серыялаў, а цяпер рыхтуе да паказу нацыянальны беларускі фільм, мы падчас размовы паспрабавалі высветліць.**



Фота з архіва Уладзіміра ЯНКОЎСКАГА.

***— Што такое, на ваш погляд, нацыянальны фільм?***

— Наша сапраўдная праблема ў вызначэнні, хто мы, адкуль і што такое Беларусь. Тут мала хто размаўляе на беларускай мове, ведае сваю гісторыю і чытае айчынную літаратуру. СССР, дзе ўсе былі савецкімі людзьмі са сталіцай Масква, ужо няма, а многія жыхары нашай ужо незалежнай краіны дагэтуль адносяць сябе да таго боку. Дык вось нацыянальны фільм прызначаны дапамагчы зразумець, хто мы такія.

***— Вы кажаце, шмат хто адносіць сябе да небеларускага боку. У чым гэта праяўляецца?***

— Па-першае, у тым, што працэнтаў дзевяноста насельніцтва не гаворыць на беларускай мове. Так было і ў савецкія часы: беларускую ўжывалі толькі настаўнікі і пісьменнікі — у выніку ў нас з дзяцінства выпрацавалася адчужэнне ад сваёй мовы, мы адчувалі сябе гаспадарамі рускамоўнай краіны, а на беларускамоўных глядзелі як на ізгояў. Такая сітуацыя — абсурд, недарэчнасць і непавага да саміх сябе. Я лічу, нас мэтанакіравана сціралі і пачалося гэта яшчэ ў Расійскай імперыі, пасля Лютаўскай рэвалюцыі мы атрымалі непрацяглую волю, але хутка ўсё пачалося наноў. Я не хачу такім чынам зрабіць нацыяналісцкі выпад супраць Расіі, я толькі канстатую, што ў Беларусі мала беларускага, а гэта амаль этнічная катастрофа. Калі няма каранёў, пра якую радзіму можа ісці гаворка — паняцце радзімы за часы СССР, дзе паўстаў кашмарны лозунг «Мой адрас не дом і не вуліца, мой адрас — Савецкі Саюз», размылася, гэта наша трагедыя. Як трапна некалі заўважыў Мікіта Міхалкоў, такая краіна магла з'явіцца хоць у Афрыцы, бо гэта была імперыя сацыялістычных рэспублік, а не нацыянальнасцяў. У сучаснай Беларусі мы, на жаль, працягваем жыць па інерцыі, культурнага адраджэння не адбываецца, і слова Беларусь рызыкуе стаць фармальным.

***— А ці можа мастацтва кіно значна паўплываць на масавую публіку?***

— Канешне, нездарма Уладзімір Ільіч Ленін казаў, што найважнейшым з мастацтваў з'яўляецца кіно: ён разумеў, як хутчэй пераканаць народ. Зараз гэтым займаецца тэлебачанне, а тады "правільнае" мысленне людзям унушалася праз масавы кінематограф.

***— Савецкае кіно добра працавала ў якасці прапаганды?***

— Вельмі добра. Многія, хто жыў тады, дагэтуль расказваюць, як добра было жыць у Саюзе. Я разумею, што кожны настальгуе аб дзяцінстве і юнацтве, але ніхто не хоча цвяроза паглядзець на тое, што было — паліцы магазінаў пустыя, замест туалетнай паперы газета, у дзяцей няма падгузкаў, пракладкі ў жанчын з'явіліся толькі ў 1991 годзе. Усе гэтыя прымітыўныя рэчы сведчаць пра тое, што пра людзей ніхто не думаў. Пры гэтым мой бацька, напрыклад, да смерці верыў, што жыў у вялікай краіне.

***— Часта кажуць, што ў той час кіно было надзвычай добрае, духоўнае і зараз такога не здымаюць.***

— Яно было бяздарнае і фальшывае. Жванецкі правільна яго ахарактарызаваў — «з жыцця галубоў». Гэта былі фільмы не пра людзей, а пра галубоў. Міф пра добрае савецкае кіно развейваецца вельмі лёгка: кожны год у Савецкім Саюзе здымалася каля 360 карцін, дык колькі за семдзясят гадоў павінна было з'явіцца выдатных? Шалёная колькасць, але паспрабуеце палічыць — з Таркоўскім, Параджанавым, Даўжэнкам, Эйзенштэйнам, Данеліяй, Гайдаем, Разанавым і найлепшымі работамі Міхалкова не набераце і сямідзесяці. Штук дваццаць адных і тых жа фільмаў — «Іронія лёсу», «Каўказская нявольніца», «Брыльянтавая рука» і іншыя — нонстопам ідзе па тэлебачанні, і ў людзей фарміруецца стэрэатып пра добрае савецкае кіно. А паглядзіце на ЗША: сорак цудоўных кінакарцін і серыялаў з'яўляецца штогод, бо працуе незалежная індустрыя, і ў ёй, што важна, няма табу. Чаму ў расійскіх серыялаў нізкая якасць: у іх ні пра што нельга гаварыць.

***— А ў нашым беларускім кіно?***

— Магу казаць толькі за сябе: у рабоце над «Купалам» палкі ў колы мне не ўстаўлялі. Не ведаю, як будзе далей, але пакуль мне ніхто не перашкаджаў.

***— Калі агучылі імя рэжысёра фільма «Купала», у дачыненні да вас выказваўся скепсіс з-за таго, што вы вядомы іншымі жанрамі — пераважна музычнымі кліпамі і рэкламнымі ролікамі.***

— Гэта з-за недасведчанасці тых, хто выказваўся. Кліпы і рэкламу я не здымаю з 2007-га і за гэтыя дванаццаць гадоў зрабіў дваццаць адзін кіна- і тэлепраект, у тым ліку з высокім глядацкім рэйтынгам. Я быў адным з найлепшых кліпмейкераў на тэрыторыі СНД, адпаведна пра мяне шмат гаварылі, а калі перайшоў у іншы фармат, маё імя растварылася, бо серыялаў выпускаецца вялізная колькасць, і яркіх сярод іх няшмат, да таго ж здымаў я для Расіі, таму ў беларускіх масмедыя з'яўляўся рэдка.

***— Але момант, калі вы перайшлі з малых формаў на вялікія, усё ж быў. З пункту гледжання майстэрства, ці не трансфармуе праца з пэўным жанрам, як у вашым выпадку, з кліпамі і рэкламай, рэжысёрскае мысленне?***

— У мяне не было складанага пераходу: мае музыкальныя кліпы былі маленькімі фільмамі, чаму я і быў непадобны да іншых кліпмейкераў. Я заўсёды хацеў займацца кіно, але не было такой магчымасці, у 1990-я яно амаль не здымалася, затое кліпмейкерства было топавай прафесіяй, у ёй я сябе і праяўляў. У рэжысёрскай працы мне цікавае ўсё, палярнасць для мяне з'яўляецца паказчыкам найвышэйшага пілатажу. Паглядзіце на Стэнлі Кубрыка: «Ззянне» — хорар, «Бары Ліндан» — сатыра, «Доктар Стрэйнджлаў» — камедыя, «Касмічная Адысея» — фантастыка, пры гэтым кожны фільм станавіўся пераваротам у кіно.

***— Вы шмат гадоў працуеце з відэакантэнтам. Мне падаецца, праз кіно можна прасачыць, як мяняецца сацыякультурны фон. Вы заўважылі нейкія перамены?***

— Час кліпаў сышоў: яны бурна развіваліся ў 1980—1990-я, калі ў іх укладалі душу і талент, я тады быў проста «зоркай». Зараз кліпмейкерства заняло дапаможную нішу, рэклама таксама стала выконваць выключна свае прамыя функцыі. У мастацтве ўвогуле ўсё моцна змянілася: яно засяродзілася на спажыўцу і стала таварам. Кіно вяртаецца да таго, з чаго пачыналася, — да атракцыёна. Калі ў канцы XIX стагоддзя людзі пужаліся і збягалі з першых паказаў братоў Люм'ер, то цяпер іх уражваюць сістэмай 3D, аб'ёмным гукам і так далей. Я таксама з жонкай і сынам хаджу на блокбастары. У кінатэатр людзі прыходзяць адпачыць, гэта заўсёды пэўны рытуал. У гэты ж час з драмай лепш застаівацца сам-насам дома, бо яна патрабуе ўвагі, гэта не адпачынак, а духоўная праца.

***— Не так даўно беларускія кінематаграфісты ў адмысловым калектыўным артыкуле задаліся пытаннем, у чым праблема беларускага кіно. Вы на гэты конт разважалі?***

— Гэта ўсё дэмагогія. Калі сферу кіно не памяняць дыяметральна, нічога развівацца не будзе. Патрэбен гаспадар — я маю на ўвазе дырэктара кінастудыі, — здольны ажыццявіць рэформы. Зараз у «Беларусьфільма» добры дырэктар, але баюся, без дапамогі правесці рэформы яму будзе складана. Сістэма павінна быць прадзюсарская, а прадзюсар — быць зацікаўлены ў тым, каб прадаць фільм. У кінабізнесе постсавецкай прасторы ўсё перавернута з ног на галаву: аўтары бяруць у дзяржавы грошы, большую частку забіраюць сабе, а астатак трацяць на кіно, то-бок зарабляюць на тым, што проста забіраюць частку з бюджэту, у выніку якасць фільма нікога не цікавіць. Я не вельмі веру ў дзяржаўную індустрыю кіно, кінастудыя магла б быць фабрыкай паслуг і рабіць хіба што адзін-два фільмы з добрымі сцэнарыямі і рэжысёрамі. Цяпер Міністэрства культуры абвяшчае конкурс і дае здымаць каму заўгодна, а колькі можна наступаць на адны і тыя ж граблі: ужо столькі гадоў на дзяржаўныя грошы здымаецца кіно і ніводнага добрага фільма не з'явілася.

***— Уладзімір, нават вы атаясамліваеце беларускае кіно з «Беларусьфільмам». Але кінастудыяй яно не абмяжоўваецца.***

— Абмяжоўваецца. На пустым месцы нічога з'явіцца не можа. Я ўсё жыццё вывучаю прафесію, я вельмі паважаю кіно, я не мог дазволіць сабе здымаць, пакуль не навучыўся, як гэта рабіць. Я не кажу, што мой шлях — правільны, але я бачыў нашы незалежныя фільмы і магу сказаць, што яны непрафесійныя. Аўтары проста іграюць у кіно, гэта ўсё — ігра. Не так даўно глядзеў інтэрв'ю майго сябра Андрэя Курэйчыка, дзе ён сказаў: «Дайце па сто тысяч трыццаці студыям і дваццаць з трыццаці фільмаў атрымаюцца дрэнныя, а дзесяць добрыя». Магу пайсці ў заклад на мільён, што добрага не будзе ніводнага. Таленавітых рэжысёраў у Беларусі пакуль ніхто не стварыў, у нас няма школы, а некаторыя думаюць, што паглядзяць у кінатэатры пару карцін і здымуць сваю.

***— Вам адразу можна парыраваць французскай новай хваляй, якую зрабілі ўчарашнія кінакрытыкі.***

— Амерыканцы, французы, італьянцы з малечым чуюць добрую музыку і глядзяць цудоўныя фільмы — з малаком маці ўбіраюць якасную культуру. А наша краіна ў гэтым дачыненні ізаляваная і нявучаная. Калі Савецкі Саюз распаўся, у нас больш за дзесяць гадоў нічога не здымалася. За гэты час змяніліся пакаленні і маладыя пасля гадоў цішыні і мярцвячыны аказаліся ля разбітага карыта, у іх не было педагагічнай падпіткі, атрымаўся вакуум. А калі ты хочаш нешта зрабіць пасля вакуума, трэба прагна вучыцца. Труфо з Гадарам сталі здымаць, калі ўсё кіно ведалі напамяць, каб адмовіць папярэднікаў і зрабіць рэвалюцыю, яны добра вывучылі мінулае. У нас людзі хочуць здымаць кіно для таго, каб пра яго сказалі: «О, гэта рэжысёр». Тут усе ва ўсё іграюць. У 1990—2000 гады я здымаў шмат кліпаў для расійскіх рок-музыкантаў: я бачыў іх спосаб жыцця і разумею, чаму добрай рок-музыкі не было. Зноў жа, з-за адсутнасці каранёў, але галоўнае — калі яны сталі займацца музыкай, яны хацелі проста іграць у яе. Марк Нопфлер спаў з гітарай і іграў па дванаццаць гадзін у дзень — гэты фанатызм ёсць магчымасць стаць вялікім музыкантам, напрыклад, як Джымі Хендрыкс. А гэтыя займаліся тым, што рабілі сабе завіўку і акружалі сябе некалькімі дзяўчынамі, нібыта фанаткамі — яны ігралі ў гэты свет. У любой галіне мастацтва цяпер адбываецца тое ж самае: ніхто ўсур'ёз не займаецца прафесіяй, вось чаму я не веру, што з тых трыццаці фільмаў дзесяць будуць добрыя.

***— А на «Беларусьфільме», значыць, не іграюць?***

— А «Беларусьфільм» — гэта механізм, які некалі завялі і ён ідзе-ідзе-ідзе, яго падсілкоўваюць грашыма, і ён працягвае ісці. Я стаў супрацоўнічаць з кінастудыяй толькі для таго, каб зняць кіно. «Купалу» да мяне прапаноўвалі чатыром рэжысёрам, яны спужаліся і адмовіліся. А я не спужаўся, бо ведаў, пра што здымаць і як здымаць. Я трэцяць гады ведаў, як гэта рабіць, у мяне проста не было магчымасці. І «Купалу» я зрабіў так, як разумею і ўмею.

***— І ў вас, на ваш погляд, атрымалася?***

— Не ведаю, я пакуль не адчуў фільм поўнасцю, мы яго не дарабілі. Нешта, напэўна, атрымалася, а нешта не — паглядзім. Ва ўсялякім выпадку ён такі, якім я хацеў яго бачыць, і мне ў гэтым ніхто не перашкаджаў. Калі ён не спадабаецца гледачу, вінаваты буду толькі я.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

**Поўную версію чытайце на сайце zviazda.by**

Вернісаж

# ВІЗУАЛЬНАЯ ЎМОЎНАСЦЬ

## «Асенні салон» вачыма экспертаў: мяккасць інтанацый VS глабальнай універсальнасці

**«Асенні салон з Белгазпрамбанкам» падводзіць вынікі. І калі журы вызначылася з прыхільнасцямі, а гледачы яшчэ маюць шанц паўплываць на лёс свайго прыза, то для арганізатараў работа працягнецца і пасля: фармат выстаўкі-продажу дазваляе працягваць кантакты з тымі, хто ўпадабаў творы і хоча купіць. Ці не адна з рыс арт-рынку, які забяспечвае цывілізаваны падыход да работы з выяўленчым мастацтвам, бо творцы ж ствараюць не толькі для гісторыі...**



Хоць і апошняе не выключаецца. Тым больш што ад сучаснага мастацтва (як і ад мастацтва сучаснасці) людзі чакаюць адлюстравання ўпершыняга жыцця з шэрагам яго вострых пытанняў і адказамі ў вобразнай форме. Асабліва ад мастацтва маладога (ці мастацтва маладых). Яны актыўна ідуць на «Асенні салон», сёлета больш за 460 аўтараў падалі заяўкі, а ўсяго за час правядзення праекта ён ахапіў больш за 2000 маладых мастакоў. Так, гэта спосаб заявіць пра сябе. Але ў кантэксце выстаўкі-продажу — яшчэ і магчымасць знайсці свайго пакупніка.

— Пяць гадоў таму мы заклалі сістэмны падыход да пабудовы арт-рынку ў Беларусі, да чаго нашы калегі з суседніх краін падышлі яшчэ ў 90-я гады, — адзначыў **Аляксандр ЗІНКЕВІЧ, дырэктар Палаца мастацтва.** — Працэс продажу не абмяжоўваецца этапам выстаўкі: работы як правіла маюць высокую цану, да іх пакупкі трэба рыхтавацца, асабліва беларускім наведвальнікам. Але традыцыйна 25 працэнтаў твораў купляюцца падчас ці хутка пасля закрыцця «Асенняга салона». Ён задае дынаміку і глядацкую цікавасць.

Матэрыяльны стымул уключаўся раней і пры падвядзенні вынікаў. Сёлета арганізатары змянілі фармат падтрымкі пераможцаў. Раней яна падмацоўвалася нават грашовымі прэміямі, але вялікага эфекту ад такога падыходу не адчувалася. Сёлета эксперымент з узнагароджаннем выліўся ў больш практычную падтрымку: прыз — калектыўны грант для чацвярых пераможцаў (трох назвала журы і аднаго вызначаюць гледачы) на выстаўку ў рамках праекта «Арт-Мінск», які адбудзецца ў маі 2020-га. Ужо дакладна, што мы там убачым творы Дар'і Сямчук (працуе пад псеўданімам Цемра), Андрэя Бусела (Hutkasmachna studio) і Наталлі Кацубы, творы якіх адзначыла журы. Лёс прыза глядацкіх сімпатый вызначаецца, пакуль «Асенні салон» не закрыты афіцыйна.

— Калі мы хочам, каб мастацтва было папулярнае, то наша задача — аб'яднаць намаганні ўсіх, незалежна ад таго, ці падзяляе хто прынцыпы суседняй галерэі і г. д. Гэта задача, якую мы ставім перад сабой у рамках «Асенняга салона з Белгазпрамбанкам», — адзначыў адзін з арганізатараў, **мецэнат Віктар БАБАРЫКА.** — Таму што мы назіраем такую ж цікавасць, як і пры арганізацыі «ТЭАРТа»: чым больш праводзім, тым больш разумеем, што прызнаныя майстры і лідары меркаванняў могуць адчуваць некаторую крыўду, а глядач пачынае прымаць гэтае мастацтва. Такой цікавасці, якая была да пятага «салона», раней не назіралася. І такое разуменне, што гледачы растуць хутчэй за тых, хто далучаны да гэтага рынку, важна не ўпусціць.

Трэба адзначыць, што члены міжнароднага журы сёлета былі настроены спагадліва да саміх твораў і прапанавалі шэраг дыпломаў: Дзмітрыю Жаўнову, Сяргею Савічу, Раману Аксёнаву, Маргарыце Навікавай. А іншых упадабаных удзельнікаў называлі проста падчас абвяшчэння вынікаў. Фігуравалі імёны тых, хто ў папярэднія гады ўжо быў сярод пераможцаў — значыць, мастакі працягваюць развівацца.

Асобнае пытанне: у які бок? Бо калі гаворка заходзіць пра Беларусь і яе прастору, неяк само сабой маецца на ўвазе, што трэба рабіць скідку на наш асаблівы шлях, у тым ліку ў дачыненні да мастацкіх з'яў. Але ці варта пра яго гаварыць, маючы на ўвазе сучаснасць? Нават эксперты, што асэнсоўвалі выстаўку, не маюць аднолькава правільнага пункту гледжання.

**Яра ВАРГА, мастацкі кіраўнік Галерэі НІТ у Браціславе, галоўны куратар Галерэі MeetFactory ў Празе (Чэхія):**

— Сёння вельмі цяжка быць мастаком. І гэта выказванне датычыцца не толькі Мінска, але ўсяго свету. І яшчэ больш цяжка быць мастаком, які ведае не толькі, як нешта зрабіць, а думае, пра што гэтае выказванне павінна быць. Мастацтва скіраванае на тое, як паўплываць на меркаванне, ці змяніць сваё, што вельмі цяжка. Я лічу, што мастацтва не павінна заставацца ў межах галерэі, яно павінна змяняцца ў публічнай прасторы, таму мне спадабаўся праект «Хуткасмачна»: яны з'яўляюцца, іх знішчаюць, яны з'яўляюцца зноў. Гэтае мастацтва няпроста зразумець, таму што яно не можа быць набытае музеем ці іншымі інстытуцыямі.

**Эгле ЮАЦЭВІЧУЦЕ, крытык і куратар сучаснага мастацтва, Нацыянальная галерэя мастацтваў у Вільнюсе (Літва):**

— Уразіла шырыня, з якой прадстаўлены розныя тэхнікі, розныя жанры, розныя віды выяўленчага мастацтва. Я хацела б звярнуць увагу на аўтараў, якія працуюць у тэхніках і з тымі пытаннямі, што хвалююць не толькі людзей у нашых краінах, але і ў свеце. Некалькі тыдняў таму я была ў Італіі на Венецыянскім біенале — сёлета ўсё там выглядае постапакаліптычна. А тут Дар'я Петрусевіч-Кавальчук звяртаецца да постапакаліптычнага кантэксту ў друкаванай графіцы. Надзея Саяпіна, якая прадставіла творы ў тэхніцы аналагавага друку, уразіла тым, як рэпрэзентуе штодзённасць. Уладзімір Сакалоўскі звярнуў маю ўвагу тым, што працуе ў постынтэрнэтэстэтыцы, дзе ўвасоблены ўплыў савецкага часу...

**Уладзімір НАЗАНСКІ, мастацтвазнавец, куратар Музея сучаснага мастацтва Эрарта (Расія, Санкт-Пецярбург):**

— На вялікай разнастайнай выстаўцы прысутнічаюць розныя мовы сучаснага мастацтва, а таксама традыцыйныя работы. Трэба адзначыць, што ў Мінску ёсць добрая пластычная школа. Скульптары амаль усе прадставілі вельмі майстэрскія якасныя работы. Каб іх было меней, магчыма, прасцей было б выбраць скульптара ў якасці пераможцы. Шкада, што цудоўная бронза Антона Нічыпарука і адзіная драўляная скульптура Дзмітрыя Кошалева не трапілі ў спіс адзначаных. Добрыя традыцыі і ў графіцы. Здавалася б, друкаваная графіка — некамерцыйны фармат, але я адзначыў бы Арцёма Цімашэнку, які працуе ў традыцыях позняга экспрэсіянізму ці неаэкспрэсіянізму...

Падаецца, што праблемы мастацтва не толькі ў тым, што слаба развіты арт-рынак. Такія рэчы як арт-рынак ці рынак сталі нечым, што павінна выклікаць трапятанне. Але мастацтва сапраўды важнае і патрэбнае. Гэта закладваецца не толькі тым ці іншым дамінуючым стандартам, якія ўводзяцца ў свядомасць людзей праз масавыя рэсурсы. Важна сапраўды, каб візуальная мова, мова мастацтва, стала мовай зносін, дапамагала адказваць на пытанні. Каб яна не была чарадой модных гульняў, а стала тым, што дапамагае чалавеку разабрацца ў праблемах сучаснага жыцця. Як бы ні выяўлялася свядомасць на аснове візуальных вобразаў, усё адно важныя пластычныя традыцыі, неабходнае рамяство, і добра, што яно захоўваецца і развіваецца. Пры гэтым ёсць шмат арт-гульні. Я не адразу паверыў, што неонавыя слоганы таксама можна разглядаць у конкурсе, але як даведаўся, то адразу прагаласаваў за групу «Хуткасмачна». Дакладна знойдзеныя мемы актуальныя не толькі ў Мінску, але ў любым пункце свету.

**Вольга БАЛАШОВА, мастацтвазнавец, намеснік дырэктара па развіцці Нацыянальнага мастацкага музея Украіны:**

— Нейкія аспекты з'яўляюцца для мяне балючымі і праблемнымі і адгукаюцца, таму што і ў нашай краіне актуальныя пытанні, звязаныя з мастацкай адукацыяй, са спосабам мыслення творцаў. Гэта важнае пытанне: якім чынам перадольваць межы, якія ўзніклі з-за ўсталявання пэўных традыцый. Некаторыя лічаць, што традыцыі — гэта выключна добра, у выпадку, калі няма альтэрнатыўных спосабаў асэнсавання нейкіх з'яў. Але толькі рамяства недастаткова для мастака. Тут бачу я шмат мастацтва, створанага цудоўнымі рамеснікамі, якія тым не менш пакуль няздольныя перайсці на іншы ўзровень — мастацкай рэфлексіі. Але выстаўка цікавая нечаканым суседствам, якое дазваляе ўбачыць кантэкст, дзе існуюць тыя ці іншыя мастакі. З аднаго боку ёсць удзел тэхнічны, тэхналагічны, рамесны, а з другога боку — інтэлектуальная праца, якая стаіць за нейкім выказваннем. Некалькі ўдзельнікаў сапраўды зачапілі. Я маю на ўвазе мастачку Цемру і яе праект «Спадчына»: ёсць асэнсаванне, якім чынам культурную спадчыну рабіць блізкай і зразумелай для новых пакаленняў, якія ад яе ўсё больш аддаляюцца.

Так ці інакш, кожны адгукаецца на тыя вобразы, што блізкія, побач у штодзённым жыцці. І як ні круці, рэчаіснасць — і думкі пра яе — закладваюць спосаб выяўлення. Беларускае мастацтва — такое як ёсць, таму што... Працяг гэтай фразы можа быць самы розны — у гледачоў і спецыялістаў, якія бачаць сусветныя тэндэнцыі. Таму погляды з боку цікавыя. Асабліва, калі ў іх ёсць розныя падыходы.

— Няма беларускага сучаснага мастацтва альбо ўкраінскага, ці нейкага яшчэ, — лічыць Вольга Балашова. — Contemporary art — гэта асаблівая мова, на якой мастак альбо размаўляе, альбо не. Мне здаецца, праблема нашых краін у тым, што мы не абнаўляем гэтую мову, яна герметычная: мы варымся ў сваім соку. Але індывідуальныя аўтары, стратэгіі якіх здолелі пераадолець прастору (тым больш да іх павагі), існуюць ва ўніверсальным кантэксце і будуць зразумелыя паўсюль.

— Беларускае мастацтва ў значнай ступені — нашчадак постсавецкага мастацтва, — адзначае Уладзімір Назанскі: — Але хіба рух мастацтва ідзе па адной каляіне, дзе нехта вырваўся наперад і абавязкова трэба вывучыць адзіную глабалісцкую мову? На ёй размаўляюць шмат мастакоў. А чым беларусы будуць цікавыя сярод іншых, калі не будзе сентыментальнасці, мяккасці інтанацыі, якая іх вылучае? Свету ўсё-такі патрэбна разнастайнасць. Я не адмаўляю развіццё новых тэхналогій і формаў выказвання, але ў імкненні развіцця важна захаваць сваю ідэнтычнасць, тое, што будзе вылучаць беларусаў сярод украінцаў, палякаў, кітайцаў. Сама мова выказвання можа быць знешне падобная, але ёсць асобная праблематыка, інтанацыя, змест. Свет насамрэч больш складаны...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**









## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 30 сентября 2019 года

| | |
|---|---|
| Организация | ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс» |
| Учетный номер плательщика | 100599687 |
| Вид экономической деятельности | Логистические услуги |
| Организационно-правовая форма | Общество с дополнительной ответственностью |
| Орган управления | Собрание учредителей |
| Единица измерения | Тысячи рублей |
| Адрес | 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 21Б, пом. 1, ком. 3 |

| Активы | Код строки | На 30 сентября 2019 года | На 31 декабря 2018 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 24 077 | 16 608 |
| Нематериальные активы | 120 | 35 | 36 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | 481 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | 995 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **24 112** | **18 120** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 311 | 413 |
| в том числе: материалы | 211 | 311 | 413 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 125 | 201 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 1 473 | 299 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 23 204 | 23 928 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | 347 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | - | 13 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **25 113** | **25 201** |
| **БАЛАНС** | **300** | **49 225** | **43 321** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 30 сентября 2019 года** | **На 31 декабря 2018 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 280 | 280 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | (1) |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 11 564 | 12 146 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (1 552) | (2 133) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 1 502 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **11 794** | **10 292** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 10 633 | 17 862 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 6 707 | 763 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **17 340** | **18 625** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 9 451 | 9 189 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 4 542 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 6 098 | 5 215 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 346 | 1 272 |
| по авансам полученным | 632 | 27 | 26 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 759 | 1 834 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 273 | 220 |
| по оплате труда | 635 | 597 | 570 |
| по лизинговым платежам | 636 | 2 025 | 364 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 71 | 929 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **20 091** | **14 404** |
| **БАЛАНС** | **700** | **49 225** | **43 321** |

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках
## за январь – сентябрь 2019 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – сентябрь 2019 года | За январь – сентябрь 2018 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 33 592 | 28 636 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (22 947) | (19 495) |
| Валовая прибыль | 030 | 10 645 | 9 141 |
| Управленческие расходы | 040 | (7 833) | (6 810) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 2 812 | 2 331 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 6 677 | 1 797 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (6 951) | (1 587) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 2 538 | 2 541 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 138 | 177 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 944 | 94 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | 3 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 194 | 80 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (212) | (42) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (71) | (18) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (141) | (24) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 2 576 | 1 003 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 2 568 | 1 000 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 8 | 3 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (3 964) | (3 514) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (1 581) | (1 500) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (2 011) | (1 990) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (372) | (24) |
| **Наименование показателей** | **Код строки** | **За январь – сентябрь 2019 года** | **За январь – сентябрь 2018 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (462) | (2 376) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 2 076 | 165 |
| Налог на прибыль | 160 | (574) | (94) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 1 502 | 71 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 1 502 | 71 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель О. М. Маргун

Главный бухгалтер О. В. Будай

30 октября 2019 г.

## Информация об аудиторском заключении по бухгалтерской отчетности ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс»

Дата аудиторского заключения: 18.03.2019 г.

Данные об организации, проводившей аудиторскую проверку: ООО «СмартАудит», зарегистрировано решением Минского горисполкома от 06.08.2013 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 192024369; местонахождение: 220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, каб. 534.

Период проведения аудита: с 01.01.2018 г. по 31.12.2018 г.

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности: бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает положение ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс» на 31.12.2018 г., финансовые результаты деятельности и изменение финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Генеральный директор О. М. Маргун

Главный бухгалтер О. В. Будай

УНП 100599687

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 15.11.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 50 %)

Лот № 1: **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57497 – административное здание,** площадь 378,2 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57496 – склад**, площадь 29,0 кв. м, **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57495 – производственное здание**, площадь 569,4 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78912 – тепловые сети,** протяженность – 63,9 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78914 – канализационная насосная станция**, площадь – 1 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78913 – водопровод**, протяженность – 105,7 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78911 – канализационная сеть**, протяженность – 87,2 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78915 – благоустройство территории**, площадь – 2117,9 кв. м. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 9А. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 741000000003000383, площадь – 0,5155 га расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Западная, 9А. **Обременения на объекты продажи:** арест (будет снят в случае продажи).

**Начальная цена продажи: 300 965,23 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 30 096,52 бел. руб.**

**Аукцион состоится 15 ноября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок и внесение задатка: по 14.11.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для перечисления задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Строительный трест № 12» Управляющая компания Холдинга «СТРОЙТРЕСТ-ХОЛДИНГ», УНП 700200537, г. Могилев, ул. Буденного, 11

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 06.07.2019 г., 18.09.2019 г.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Дополнительную информацию можно получить по тел.: **+375222 72-41-14, +37529 624-26-25, сайт ino.by**

**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых третьих повторных торгов в форме аукциона по продаже комплекса недвижимого имущества ООО «Дорабел» (УНП 800000096, Минский район, Щомыслицкий с/с, район д. Озерцо, здание ЧП «Кормсис», комн. 14Б.), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов***: **15 ноября 2019 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 31 октября 2019 года до 17.00 13 ноября 2019 года.

***Место проведения торгов:*** Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **ООО «Дорабел» (УНП 800000096)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт».

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте **http://bankrot.gov.by/**». Контактный телефон +375296847176.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 190 (29057) за 05.10.2019

**ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод» 8 (0232) 21 60 07

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, руб. с НДС | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – капитальное строение (столовая) с инв. № 350/С-141588, площадью 5842,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/20, (составные части и принадлежности: галерея, забор, бордюр проезжей части, мощение, забор, бордюр тротуара, мощение) по начальной цене – **205 046,40 руб.** Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006508 площадью 0,7415 га;<br>– оборудование: 1. Конденсаторная установка БСК-0,76 кВар с инв. № 10268 по начальной цене – **900,00 руб.**, 2. Конденсаторная установка БСК-0,76 кВар с инв. № 10269 по начальной цене – **900,00 руб.**, 3. Лифт грузовой с инв. № 12288 по начальной цене – **900,00 руб.**, 4. Лифт грузовой с инв. № 12588 по начальной цене – **1 400,00 руб.,** 5. Лифт грузовой с инв. № 1611 по начальной цене – **1 300,00 руб.**, 6. Лифт грузовой с инв. № 1613 по начальной цене – **1 600,00 руб.**, 7. Трансформаторная подстанция 2КТП с инв. № 221/1М по начальной цене – **9 400,00 руб.** | **221 446,40 руб.** | **11 072,32 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Срок и место подачи заявления** | **По 2 декабря 2019 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **4 декабря 2019 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете «Звязда» от 02.11.2019 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

# ПРА ВАЖНАЕ — НА МОВЕ ТАНЦА

## Фестываль сучаснай харэаграфіі рыхтуецца да сустрэчы з гледачамі

**XXXII Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC) пройдзе чарговы раз з 18 да 23 лістапада і збярэ артыстаў з Беларусі, Бельгіі, Расіі, Украіны, Іспаніі, Нідэрландаў. Афіша IFMC-2019 прадстаўлена сёлета рознафарматнымі пастаноўкамі, якія будуць дэманстравацца на канцэртных пляцоўках у Мінску і ў Віцебску.**

**Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных свецкіх культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Ірына ДРЫГА** падкрэслівае: «Гэты фестываль — найбуйнейшы сярод прафесійных фестываляў сучаснай харэаграфіі, якія праводзяцца ў нашай краіне. Тыя пастаноўкі, з якіх складаецца праграма, заўсёды адрозніваюцца высокім густам, якасцю і прафесійным узроўнем».

У рамках фестывалю таксама адбудуцца інтэрактыўныя лекцыі, майстар-класы, семінары, круглыя сталы, выстаўкі. Сярод іх фотапраект «Сучасны танец у Віцебску. Канец XX — пачатак XXI стагоддзя» фатографа Ігара Гусакова, які перадасць атмасферу IFMC за гады яго існавання. Таксама тут будзе прадстаўлена выстаўка скульптуры «На краі Сусвету» мастака Сяргея Сотнікава.

Аднак эпіцэнтрам IFMC-2019 стане Беларускі конкурс сучаснай харэаграфіі. Для ўдзелу ў ім запрошаны харэаграфічныя калектывы, балетныя трупы і артысты танцавальных праектаў, творчасць якіх суадносіцца з паняццем «сучасная харэаграфія».

— Кожны год наш фестываль пашырае маштабы, аднак неад'емнай часткай з'яўляецца конкурс. Калі мы толькі пачыналі, то гэта была вялікая палітра, бо нам дасылалі заяўкі эстрадныя калектывы, нумары ад вар'етэ і тады яшчэ мала хто меў уяўленне пра тое, што такое «сучасная харэаграфія». Зразумела, паралельна з гэтай сферай адбываўся пэўны творчы селект, і мы, паступова займаючыся самаадукацыяй, цяпер маем паўнавартаснае разуменне, што гэты кірунак сабой уяўляе, — падзялілася **намеснік генеральнага дырэктара ДУ «Цэнтр культуры «Віцебск» Марына РАМАНОЎСКАЯ.** — Сёлета конкурс беларускі, на яго паступілі 33 заяўкі, і зараз працуе камісія адборачнага відэатура. Удзельнікі прадставілі 38 твораў, сярод якіх ёсць мініяцюры, аднаактавыя балеты і іншыя жанры. Па выніках камісія вызначыць тых, чыя творчасць будзе прадстаўлена на конкурснай сцэне.

Ацэньваць узровень майстэрства сучасных харэографаў будзе міжнароднае журы і экспертны савет (яго задача — адсачыць творы на наяўнасць плагіяту).

Акрамя конкурсных выступленняў, гледачы ўбачаць пастаноўкі розных кірункаў і тэматыкі. Аматарам класікі ў сучасным прачытанні будуць прадстаўлены харэаграфічны спектакль «Ганна Карэніна» Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Яўгена Вахтангава. Чакае нас і сусветная прэм'ера — адна з самых страшных гісторый Мікалая Гогаля ў балеце паводле аповесці «Вій». А калі вы даўно хацелі ўбачыць харэаграфічную эклектыку, то вам на спектакль «OSKARA» калектыву з Іспаніі. Сюрпрыз падрыхтавала Віцебская абласная філармонія: тут пакажуць бельгійска-галандскі танцавальны праект «Sweat baby sweat», дзе элементы буто, ёгі і акрабатыкі пераплятаюцца ў кантэксце гісторыі аднаго кахання.

**Алена ДРАПКО.**

Экаініцыятыва

# ПІЦЬ ЗА ЗДАРОЎЕ... ПЛАНЕТЫ

## На сталічнай вуліцы Кастрычніцкай зрабілі прыпынак «Тупік»

**Рэтра-аўтобус, даверху напампаваны 20 тысячамі пэт-бутэлек, прастаіць на прыпынку дзесяць дзён, каб людзі маглі на свае вочы пабачыць, колькі пластыкавых адходаў за тыдзень утвараецца барамі, рэстаранамі і офісамі толькі адной сталічнай вуліцы. Арганізатары экалагічнай арт-інсталяцыі прадпрыемства «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» і рух «Мэта-99» плануюць за два тыдні зрабіць вуліцу вольнай ад пластыку.**






Назва прыпынку, які знаходзіцца ў канцы вуліцы, сімвалічная. Яна азначае не проста завяршэнне праезду, а і тупіковы напрамак бясконцага выкарыстання аднаразовага пластыку ў бяздумных памерах. Каля аўтобуса дзяжурылі дзве смерці з косамі, якія алегарычна нагадвалі, што чакае ўсіх нас, калі мы працягнем выкарыстоўваць шмат пластыку.

*— Мы хочам прыцягнуць увагу людзей да аднаразовых пластыкавых рэчаў, у прыватнасці да ПЭТ-бутэлек. Уявіце, што смецце, якога хапае, каб напоўніць цэлы аўтобус, за тыдзень стварае толькі адна вуліца, а што адбываецца ў сталіцы, краіне, усім свеце. Многія аднаразовыя рэчы служаць літаральна пару хвілін,* — кажа **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — *Сусветны эканамічны форум падлічыў, што калі тэндэнцыя па выкарыстанні пластыкавых рэчаў працягнецца, то ў 2050 годзе пятая частка сусветнай здабычы нафты будзе расходавацца на тое, каб забяспечваць нас пластыкавымі рэчамі.*

Адзін з варыянтаў ужываць менш пластыку — насіць з сабой свой кубак, у які можна наліваць напоі. Некаторыя ўстановы нават даюць за гэта зніжкі, як напрыклад кафэ MonkeyFood, дзе ў межах ініцыятывы My cup, please («Мой кубак, калі ласка») за любы напой, наліты ў тару спажыўца, плаціш на 10 % менш. Тут таксама існуе веладаставка заказаў.

*— Трэба пераасэнсоўваць сваё паўсядзённае жыццё, рабіць адзін адному экалагічныя падарункі,* — упэўнена **Марта СКУГАРАВА, спецыялістка па камунікацыі веган-фастфуду MonkeyFood.** — *Збіраючыся працаваць адразу ў экакірунку, мы думалі, якая ў нас будзе ўпакоўка, пастаўшчыкі, ежа, напоі, каб усё гэта адпавядала задуманай намі місіі. Любы бізнес, калі ён хоча развівацца, павінен разважаць не канцэптам тут і цяпер, а думаць, як ён будзе развівацца, да чаго ён ідзе.*

Яшчэ нядаўна экалагічная ўпакоўка была рэдкасцю, а праз гэта была досыць дарагой. Аднак чым больш устаноў яе выкарыстоўваюць, тым больш з'яўляецца пастаўшчыкоў і спажыўцоў такой тары і тым таннейшая яна робіцца, мяркуе Марта:

*— Разважаць над тым, наколькі дарагая экаўпакоўка, не варта, калі ты думаеш не толькі пра сёння. Выкарыстоўваць танную пластыкавую тару дорага для нашай планеты.*

Аператар плануе падарыць офісам, якія знаходзяцца на вуліцы Кастрычніцкай і пажадаюць далучыцца да акцыі, што мае на мэце зрабіць тусовачнае месца вольным ад пластыку, спецыяльныя ёмістасці для збору адходаў шкла, паперы і пластыку.

У найбліжэйшыя дні каля ўстаноў на Кастрычніцкай паставяць кантэйнеры для збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. А бары, якія далучацца да экаакцыі, будуць прапаноўваць гасцям піць за здароўе планеты, матывуючы іх заказваць напоі ў шкляным посудзе.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# З ЛЮБОЎЮ, МІНСК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Зрэшты, асаблівасць праекта не ў яго маштабе і інтэрнацыянальнай творчай камандзе, а перадусім ва ўнікальным прыкладзе трох- (а па вялікім рахунку, нават пяці-) сектарнага ўзаемадзеяння дзяржавы, бізнесу і гарадскіх актывістаў. Ідэя нарадзілася і рэалізоўвалася супольна — адміністрацыяй Фрунзенскага раёна сталіцы, стрыт-арт-пленэр Urban Myths і кампанія А1 вырашылі не толькі ўпрыгожыць родны горад, але паказаць рух Беларусі ў будучыню праз вобразы маладых людзей — герояў новага часу. Больш за тое, перад тым, як прыступіць да работы, арганізатары праекта з дапамогай спецыялістаў Белдзяржуніверсітэта правялі сацыялагічнае апытанне сярод жыхароў гэтых і навакольных шматпавярховікаў, як яны ставяцца да перамен — амаль 86 %, альбо больш чым чатыры пятыя, горача падтрымалі ідэю стварэння муралаў на фасадах, а больш за 50 % адзначылі, што аблічча раёна неабходнае паляпшэнне. Таксама пракансультаваліся з выкладчыкамі кафедры манументальнага мастацтва Акадэміі мастацтваў, каб будучы трыпціх не дысанаваў, а гарманічна спалучаўся з існуючай забудовай.



«Фрунзенскі раён — самы буйны па колькасці жыхароў у сталіцы. Ідэя запрасіць мастакоў, каб надаць тыпавым жылым дамам, збудаваным 30—40 гадоў таму, больш сучасны выгляд, падалася нам цікавай, — кажа **першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Дзяніс ДРАПЕЙ.** — Сёння мы шукаем новыя падыходы да добраўпарадкавання і змянення аблічча раёна, і для нас важна, як жыхары ставяцца да гэтага».



Безумоўна, дзеля большай эфектнасці арганізатары сталіся як мага даўжэй трымаць праект у сакрэце, аднак муралы плошчай каля 250 квадратных метраў — не тыя карціны, якія можна да часу прыкрыць палатном і схаваць з вачэй пільных гараджан. Таму ўжо ў кастрычніку мінчане ўбачылі, як ствараюцца ў тэхніцы фотарэалізму работы «Фрыланс» і «Лічбавы свет». Дарэчы, усе часткі і праект у цэлым носяць менавіта беларускамоўныя назвы, і гэта, акцэнтуе **кіраўнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі А1 Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ,** прынцыповы момант.

«Мне здаецца, гэта першы такі праект у Мінску, ад пачатку да канца зроблены прадумана і асэнсавана, з улікам меркаванняў усіх зацікаўленых», — падсумоўвае **каардынатар Urban Myths Алег ЛАРЫЧАЎ.** Зрэшты, праўдзівасць гэтага сцвярджэння можна будзе праверыць нашмат пазней, калі грамадства, медыя, архітэктары і прадстаўнікі навуковай супольнасці ацэняць ужо гатовы трыпціх.

Левая яго частка — аўтарства сербскага мастака Artez, які ўклаў у партрэт дзяўчыны-фрылансеркі свае ўражанні ад цэнтра Мінска — раёна тусовачнай Зыбіцкай і старой Нямігі. Тут можна ўбачыць і «па-моднаму» надзеты рукзак з ноўтбукам, і колішні талончык на метро, якое прывяло мастака ў захапленне, і валошку як адзін з нацыянальных сімвалаў Беларусі... Гераіня правага мурала «Лічбавы свет» беларускага мастака Mutus (псеўданім пінчаніна Яўгена Сасюры) — таксама цалкам рэальная дзяўчына, фота якой аўтар убачыў у сацсетках. Ад фота да канчатковай выкрышталізаванай ідэі, гаворыць Яўген, прайшло некалькі месяцаў напружанай працы і звыш 60 варыянтаў эскізаў. У гатовай рабоце аб'ядналіся міфалогія і тэхналогіі: нітка лёсу — яе сплятае дзяўчына, як калісьці славянская багіня часу і лёсу людскога, апякунка жанчын Макаш — бярэ пачатак з лічбавага «воблака». «Спачатку жыхары дома не вельмі разумелі, што адбываецца, а калі з фрагментаў пачаў складвацца малюнак, прыходзілі мяне падтрымліваць — хто прапаноўваў бутэрброды, хто чай ці віно», — усміхаецца мастак.

У завяршальнай частцы трыпціха «Мы — героі будучыні» маладых, але ўжо вельмі вядомых мастак з Каталоніі Slim разам з напарнікам Jofre Oliveras паспрабуе ўвасобіць вобраз сям'і, узаемнай падтрымкі і клопату, як самых важных каштоўнасцяў — не толькі для беларусаў або іспанцаў, а для людзей усіх нацыянальнасцяў. Героямі трэцяй работы, анансавалі арганізатары, таксама сталі ўбачаныя на вуліцах звычайныя гараджане, але гэтым разам маленькія — якраз тыя, у чыіх руках прагрэс і новыя тэхналогіі, каму жыць і працаваць у Мінску заўтрашнім. І нават калі муралы да гэтага часу марольна састарэюць ці будуць замаляваныя, аўтары па-філасофску заўважаюць: галоўнае — упрыгожыць Мінск сёння, натхніць жыхароў і гасцей сталіцы і прымусіць іх задумацца пра важныя рэчы, а не захаваць як мага даўжэй свой аўтограф на фасадзе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Ютуб пакажа — бацюшка адкажа

## Святар храма вёскі Міханавічы на мове маладых расказвае пра вечнае

**«Звязда» тры гады таму ўжо пісала пра бацюшку, які здымае ролікі і шукае кантакт з моладдзю дзеля крушэння стэрэатыпаў аб праваслаўі, якія моцна замацаваліся ў савецкі, постсавецкі час і цяпер працягваюць жыццё ў форме мемаў. Змест пастаянны, форма ж залежыць ад часу. Мова маладога пакалення значна адрозніваецца ад мовы іх бацькоў. Таму, каб дасканала растлумачыць чалавеку тыя ці іншыя ўстойлівыя рэчы, трэба знаходзіцца ў адной плоскасці з суб'ектам. Айцец Аляксандр Кухта знайшоў новы ракурс на праваслаўе, абраўшы форму падачы кантэнту цераз YouTube.**

### Бацюшка адкажа#А праграмістыка пачакае

Вырас Аляксандр у звычайнай сям'і. І вучыўся ў ліцэі БДУ, рыхтуючы сябе да прафесіі праграміста. Але паралельна з гэтым малады чалавек адчуваў, што «ягонае, сапраўднае» дзесьці побач... З 16 гадоў Аляксандр прыслужваў у храме. З гэтага ўзросту юнак пачаў сурьёзна задумвацца пра веру.

— Не так страшна, калі бацькі не водзяць дзіця ў храм. Дрэнна, калі яны самі, дарослыя, не імкнуцца да духоўнага жыцця. Дзіця не асэнсоўвае таго, што адбываецца навокал, і калі бацькі самі сур'ёзна не ставяцца да Царквы, прыходзяць на службу, бо так ім сказалі бабулі, то які сэнс? Крута, калі сям'я ходзіць у храм, вядома ж і дзіця бяруць з сабой, а тое, тым часам, звыкаецца з абстаноўкай. Але сапраўднае асэнсаванне прысутнасці Бога прыходзіць у больш дарослым узросце. Чалавек сам знаходзіць веру, церaз свае памылкі, прайшоўшы па-свойму нясросты шлях. У мяне ёсць маленькі сын, спадзяюся, што ў будучым ён таксама захоча пайсці па маіх слядах. Але — выбар за ім.

**— Сям'я дапамагае здымаць ролікі?**

— Мая сям'я мяне трывае, і за гэта ім вялікі дзякуй.

Хто «не ў тэме», падумае: ну як гэта? Няўжо ў бацюшкі часу не хапае на сям'ю? Здымаць ролікі — адна справа. Падтрымліваць свой YouTube-канал — ужо іншая, і гэта не забава, а карпатлівая праца, якая з'ядае час імкліва. Даводзіцца траціць на стварэнне аднаго толькі выпуску больш за 30 рабочых гадзін. Зразумела, што, калі ты праны код не атрымалася, у полі зроку аказаліся равеснікі бацюшкі. Справа ў тым, што людзі 25—30 гадоў па статыстыцы найбольш актыўна наведваюць YouTube. Гэта аблегчыла работу, але не зменшыла яе аб'ёму. Назву абыгралі: «Batushka адкажа», а фармат выпускаў нагадвае відэа-дзённік інтэлектуальнага характару. Асноўная задача: пакрокава, максімальна проста і з прыкладамі паказаць чалавеку, што сабой уяўляе праваслаўная вера. Што яна зусім не такая, як



Фота Аляксандра РУЖАЧКІ.

водзіш так шмат часу на студыі, а цябе чакаюць дома жонка і сын, то гэта не зусім нармальна. Тут варта падумаць, што важней. Цяпер наш бацюшка-блогер «збавіў хуткасць»: скарацію час на падрыхтоўку ролікаў і нават адмовіўся ад некаторых праектаў. YouTube — цудоўна, але ж побач бяжыць сапраўднае жыццё...

### Ламаем хэйтарскія стэрэатыпы

Перш чым здымаць, айцец Аляксандр пачаў думаць, на якую аўдыторыю будзе працаваць і якім чынам да яе звяртацца. Для таго каб быць зразуметым у пэўным асяроддзі, варта ведаць яго культурны код, адчуваць пакаленне. Да падлеткаў усталяваць культуряе сёння звыклі прадстаўляць у мемах. За што спалілі на вогнішчы Бруна і кананізавалі апошняга цара Расійскай імперыі? Што агульнага ёсць паміж навукай і рэлігіяй? Што насамрэч такое пост? Тэмы ролікаў самыя розныя, але ў аснове кожнай ляжыць грунтоўнае і сістэмнае тлумачэнне законаў і правілаў, якімі могуць напужаць «усёведныя» бабулькі і тыя, хто любіць шукаць ва ўсім палітычныя і карыслівыя матывы.

Мова блогера адпавядае аўдыторыі — сучасныя модныя словы, адпаведна падрыхтаваныя жарты, іронія, метафары, добрыя мемы. Айцец Аляксандр абраў рускую мову, таму што яго канал праглядаюць не толькі ў Беларусі.

— Прыходзіцца бачыць паведамленні з іранічным адценнем.



Калі трапляюцца складаныя пытанні, і я не ведаю, што адказаць, то напраўляю чалавека на праект «Бацюшка Анлайн». Часцей гучаць тэмы асабістага, інтымнага характару. Я не вырашаю сямейныя канфлікты праз інтэрнэт, не стаўлю «дыягназ» той ці іншай сітуацыі такім чынам. Кожная гісторыя — суб'ектыўная і патрабуе індывідуальнага падыходу да чалавека. Дыстанцыйна, у паведамленні, складана змясціць неабходную параду. У інтэрнэце мая справа, у першую чаргу, гаварыць пра Бога.

Даводзілася атрымліваць паведамленні ад няверуючых людзей з пазітыўнай ацэнкай роліка. Дзесьці класна абыграна, цікава растлумачана і без лішняга пафасу. Прыемна чытаць такія каментарыі, бо, хто ведае, чалавек праглядзіць адзін-два ролікі, затым палезе гугліць факты (хоць бы дзеля пацвярджэння таго, аб чым кажа бацюшка-блогер), тым самым паглыбляючыся ў тэму. Мэта ў гэтым і заключаецца.

Праглядаючы відэа маладога бацюшкі-блогера, адчуваеш свежы погляд на хрысціянства. Многія дзівяцца з такога стылю, хтосьці проста цікавіца, ёсць і тыя, хто не прымае такі радыкальны ход.

— Усім падабацца немагчыма. Калі ёсць якія непаразуменні між людзьмі, то гэта залежыць ад таго, у якім ракурсе яны глядзяць на адну і тую ж рэч. Дзецям тлумачаць фізіку на простых прыкладах, якія, у сваю чаргу, не ўспрымаюцца ўсур'ёз на вучоным узроўні.

### ...Выключыць YouTube і паехаць у Міханавічы

Вёска Міханавічы невялікая, таму прыход храма Дзімітрыя Растоўскага, у якім айцец Аляксандр служыць у якасці памочніка настаяцеля, досыць сціплы. Бацюшка прызнаецца, што непаразуменняў з прыхаджанамі няма, вельмі хутка ўсталяваліся добрыя, даверлівыя адносіны, нягледзячы на тое, што бацюшка малады. Айцец Аляксандр — іерэй, скончыў Мінскую духоўную семінарыю і магістратуру Мінскай духоўнай акадэміі.

**— Былі на Святой Зямлі?**

— Не, у Іерусалім калі і давядзецца паехаць, то ў якасці звычайнага турыста: з фоцікам і без рызы.

Я ўстаю, каб развітацца, айцец Аляксандр сядае за ноўт: зноў вывучае праграмаванне, адно другому не перашкаджае, тым больш што блогеру без гэтага складана.

**Кацярына КАСЦЕВІЧ.**

---

Яўгена ПЯСЕЦКАГА **Фота слова**





*Усіх маіх дзядоў,*
*узятых вечным сном,*
*Хто веры не змяніў*
*і праўды не парушыў,*
*Прашу адно, нібы*
*прад Божым алтаром:*
*Маліцеся за нас,*
*мацуйце нашы душы...*
*Маліцеся, каб нам*
*збыліся вашы сны*
*Пра шчодрыя палі*
*і вольныя абшары,*
*Каб матчынай журбы*
*не бачылі сыны,*
*Каб бацькаву раллю*
*не зачарнілі хмары,*
*Каб ад дзявочых слёз*
*ніколі не сшарэў*
*Валошкамі*
*уквечаны абрус,*
*Каб у небе веснавым*
*жаўрук не анямеў —*
*Маліцеся за нашу Беларусь.*

---

Даты | Падзеі | Людзі

**2 ЛІСТАПАДА**

У краіне

**1909** год — нарадзіўся (вёска Прусы, цяпер у Салігорскім раёне) Максім Лужанін (Аляксандр Амвросьевіч Каратай), беларускі паэт, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Працаваў у часопісе «Узвышша», на Беларускім радыё. З 1935 года — на выдавецкай рабоце ў Маскве. У 1944—1953-м — у газеце «Звязда», часопісе «Вожык», у 1967—1971-м — галоўны рэдактар сцэнарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». У 1933 годзе быў рэпрэсаваны, рэабілітаваны ў 1956-м. Аўтар паэтычных зборнікаў «Галасы гарадоў», «Шырокае поле вайны», «Як нараджаўся новы свет» і інш. Выступаў як перакладчык, крытык і публіцыст, пісаў сцэнарыі фільмаў, творы для дзяцей. Памёр у 2001 годзе.



**1974** год — нарадзіўся (г. Мінск) Руслан Альбертавіч Салей, беларускі спартсмен (хакей з шайбай), абаронца, заслужаны майстар спорту Беларусі. Выступаў у мінскіх камандах «Юнацтва», «Дынама», «Цівалі». З 1996 года — у клубе «Анахайм Майці Дакс» (ЗША), у складзе якога ў 2003 годзе выйшаў у фінал Кубка Стэнлі. Член нацыянальнай зборнай каманды Беларусі, у складзе якой заняў 4-е месца на XIX зімовых Алімпійскіх гульнях (2002); 5—8-е месцы — на XVIII зімовых Алімпійскіх гульнях (1998). Чэмпіён Беларусі (1994—1995). Загінуў разам з камандай «Лакаматыў» 7 верасня 2011 года пры ўзлёце самалёта ў Яраслаўскім аэрапорце.

У свеце

*Сусветны дзень мужчын. Адзначаецца з 2000 года па ініцыятыве Венскага магістрата, фонду М. С. Гарбачова, аддзялення ААН у Вене і міжнароднай арганізацыі «Медыкэл Канэкшн».*

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Компрессор 4ВУ1-5/98, инв. № 70021115 | Могилевская обл., Осиповичский р-он, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, д. 14 | 2 970,00 | 297,00 | 148,50 |
| 2 | Кран козловой эл. г/п 10 тн, инв. № 70021127 | | 11 250,00 | 1125,00 | 562,50 |
| 3 | Кран-балка груз. 3,2 L 22,5 м, инв. № 70021132 | | 3 510,00 | 351,00 | 175,50 |
| 4 | Кран-балка подв. г/п 3 т L 22,5 м, инв. № 70021136 | | 3 690,00 | 369,00 | 184,50 |
| 5 | Кран-балка подв. г/П3тн L22,5 м, инв. № 70021124 | | 3 330,00 | 333,00 | 166,50 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Цена на предмет торгов снижена на 10 %. **Окончание приема заявлений в 18.00 15.11.2019 г.**

Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 169 от 06.09.2019 г.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник, явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста 5 % от начальной цены предмета торгов.**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион по лотам состоится 18.11.2019 в 15.00 (регистрация участников с 14.50 до 15.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), проводимом __.__.2019 г.»

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Чеслав, тел. 8 (029) 275 60 59.

Дополнительная информация по предметам торгов: Погосова Анаида, тел. 8 (029)308 28 97, e-mail: **a.a.pogosova@tut.by.**

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: **frondera@mail.ru** • сайт **https://orgtorg.by** |
| **Продавец** | РУП «Жилкоммунтехника» в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-консультант»<br>☎ +375 (29) 698-51-76, +375 (29) 502-77-77, +375 (29) 392-89-06, +375 (17) 395-58-13 |

**4 декабря 2019 г. ИЗВЕЩЕНИЕ № 17-А/2019**

## о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в районе индивидуальной застройки «Прибр-Западный» по ул. Старобелицкой, 14 | 340100000004005827 | 0,1124 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений. Обременения: присутствие дикорастущей древесной растительности. | 99 | 2 006, 34 | 100,00 | 3 365,86 |
| 2 | в районе ул. Проселочной (участок 2) | 340100000004001538 | 0,0810 | | Участки органичений в использовании не имеют. Обременения: присутствие зеленых насаждений, частично использовались под огородничество. На участке 2 присутствует сетчатое ограждение | 99 | 5 341,95 | 250,00 | 2 196,90 |
| 3 | в районе ул. Проселочной (участок 3) | 340100000004001539 | 0,0803 | | | 99 | 5 295,78 | 250,00 | 2 256,20 |
| 4 | в районе ул. Проселочной (участок 4) | 340100000004001540 | 0,0788 | | | 99 | 5 196,86 | 250,00 | 2 201,90 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»)

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №№ 3–6, №№ 3–14)

